

ПРАФЕСІЙНЫЯ І АСАБІСТЫЯ САКРЭТЫ ПРЭС-САКРАТАРА МУС 5

ДЭПУТАТЫ ГОМЕЛЬШЧЫНЫ «ЎЗЯЛІСЯ» ЗА ЦЭНЫ МС



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

4 САКАВІКА 2022 г.
ПЯТНІЦА
№ 44 (29666)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
+TVпраграма

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Іван КРУПКО, старшыня Гомельскага аблвыканкама:**

*«Мы цэнім брацкую сувязь, добрасуседскія адносіны. Мы гатовыя і ўжо аказваем дапамогу грамадзянам Украіны. Гэтак жа, як і ў 2014 годзе. За гэтыя 8 гадоў у рэгіён прыехала амаль 50 тысяч украінцаў. Адны вярнуліся дадому, а многія, у прыватнасці, з Данецкай і Луганскай абласцей, жадалі атрымаць беларускі пашпарт. За мінулы год, па даных абласной міграцыйнай службы, беларускае грамадзянства атрымалі 730 украінцаў. За апошнія дні Гомельская вобласць ужо прыняла 55 бежанцаў з Украіны. Як кіраўнік рэгіёна запэўніваю: акажам любую пасільную дапамогу — медыцынскую, калі спатрэбіцца, забяспечым дзяцей месцамі ў дзіцячых садках і школах, дарослым дадзім работу. Але ўсім сэрцам, усёй душой увесь беларускі народ, жыхары прыгранічнага Гомельскага рэгіёна жадаюць міру і спакою на зямлі Украіны».*

# На варце спакою

Прэзідэнт павіншаваў супрацоўнікаў і ветэранаў органаў унутраных спраў са 105-й гадавінай з дня ўтварэння беларускай міліцыі, паведаміла прэс-служба Прэзідэнта.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што гэтае свята сімвалізуе прыхільнасць праваахоўнікаў да найлепшых традыцый служэння народу і краіне, якія закладваліся многімі пакаленнямі супрацоўнікаў МУС.

— Ваша самаадданасць, высокая мера адказнасці і прафесіяналізму вызначаюць гатоўнасць органаў унутраных спраў эфектыўна забяспечваць правапарадак і грамадскую бяспеку, рэальна абараняць маёмасныя і сацыяльныя правы грамадзян, гарантаваныя Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, — гаворыцца ў віншаванні. — Разам мы захавалі і ўмацавалі мір і стабільнасць, збераглі Айчыну ад беспарадку і беззаконня. Беларускія грамадзяне ўпэўнены, што і надалей будуць надзейна абаронены дзяржавай, законнымі сілай і ўладай, якія дадзены вам народам.

Прэзідэнт падзякаваў супрацоўнікам і ветэранам органаў унутраных спраў за службу Радзіме і пажадаў ім моцнага здароўя, шчасця, дабрабыту і поспехаў у адказнай дзейнасці ў імя працвітання Беларусі.



Віцябляне Марына і Дзмітрый РАЧЫНСКІЯ не так даўно служаць у органах унутраных спраў, але карыстаюцца павагай у кіраўніцтва. Марына працуе інспектарам крымінальна-выканаўчай інспекцыі УУС адміністрацыі Чыгуначнага раёна г. Віцебска, Дзмітрый — інспектар ДПС міжраённага аддзела ДАІ УУС Віцебскага аблвыканкама.

**Фота БелТА.**

## КОРАТКА

- «Белпошта» датэрмінова выплаціць пенсіі за 8 сакавіка.
- **БЧ адкрыла больш чым 50 дадатковых кас і імкнецца аднавіць работу электронных сэрвісаў.**
- Беларусь удзельнічае ў Еўразійскім саміце па вышэйшай адукацыі ў Стамбуле.
- **Першыя вясновыя кветкі пачалі распускацца ў Белавежскай пушчы.**



Падзея

## На высокім арганізацыйным узроўні

### Цэнтральная выбарчая камісія зацвердзіла вынікі рэспубліканскага рэферэндуму

**Такім чынам, за новы варыянт Асноўнага Закона краіны прагаласавалі 82,86 % выбаршчыкаў, якія прынялі ўдзел у рэферэндуме (або 65,16 % ад грамадзян, унесеных у спісы для галасавання). Нагадаем, на рэферэндум было вынесена адно пытанне: ці прымаеце вы змяненні і дапаўненні да Канстытуцыі Беларусі?**

Як заявіў падчас пасяджэння **старшыня Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў Ігар КАРПЕНКА,** рэферэндум прайшоў арганізавана, у адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам. «Мы атрымалі заключэнне міжнародных назіральнікаў, якія дастаткова актыўна працавалі ў межах рэферэндуму, — заўважыў ён. — Зладжаная работа ўсіх паказала, што рэферэндум прайшоў на высокім арганізацыйным узроўні. Яўка грамадзян была дастаткова высокая. Гэтаму папярэднічала сур'ёзная работа, звязаная са змяненнямі і дапаўненнямі ў Канстытуцыю. Гэта і работа Канстытуцыйнай камісіі, і шматлікія сустрэчы, дыялогавыя пляцоўкі, звароты грамадзян».

СТАР. 2

Здароўе

## У ШКОЛАХ І ПАЛІКЛІНІКАХ, АЛЕ СА ЗГОДЫ БАЦЬКОЎ

### Як праходзіць вакцынацыя падлеткаў ад COVID-19

**У Беларусі назіраецца зніжэнне захваральнасці на COVID-19 ды іншыя рэспіраторныя інфекцыі, і медустановы паступова пераходзяць да работы ў звыклым рэжыме і аказання планавай дапамогі. Пятая хваля, якая доўжылася не менш за чатыры тыдні, нарэшце, пайшла на спад. У такі час якраз і рэкамендуецца зрабіць прышчэпку ад каранавіруса тым, хто яшчэ не паспеў. Актыўна праводзіцца вакцынацыя падлеткаў. Яе можна прайсці як у навучальных установах, так і ў паліклініках па месцы абслугоўвання. Перыяд зніжэння захваральнасці, як нагадваюць медыкі, падыходзіць для прафаглядаў, у прыватнасці, выпускнікоў, каб атрымаць даведку для паступлення, бо ўрачы цяпер трохі менш загружаныя. Карэспандэнт «Звязды» даведалася, як прышчапіцца ад каранавіруса ў школе і паліклініцы, атрымаць сертыфікат аб вакцынацыі і медыцынскую даведку для паступлення.**



СТАР. 6

ISSN 1990 — 763X
22044

З першых вуснаў

# «Я ганаруся кожным з вас»

**Шэраг тэрміновых нарад у Палацы Незалежнасці змяніла традыцыйнае мерапрыемства. Напярэдадні Дня жанчын Аляксандр Лукашэнка ўручыў пагоны вышэйшаму афіцэрскаму кіруючаму складу і ордэны Маці за выхаванне і нараджэнне пяці і больш дзяцей. Таксама падчас цырымоніі атрымалі свае медалі выдатныя прадстаўнікі разнастайных сфер дзейнасці і артысты, якія ўзнагароджаны званнем заслужаных.**

«Сёння ў Палацы Незалежнасці вельмі ўрачысты дзень. Мы ўручаем узнагароды сапраўдным жанчынам і сапраўдным мужчынам. Гэта ўжо стала традыцыяй. Я шчыра ганаруся кожным з вас, таму што разумею, якой вялікай працай дасягаюцца сёння поспехі ў любой сферы, няхай гэта будзе вытворчасць, медыцына, адукацыя, мастацтва або спорт», — заўважыў кіраўнік дзяржавы.

Большасць з узнагароджаных па традыцыі — прадстаўніцы прыгожай паловы чалавецтва, якія нарадзілі і выхавалі пяць і больш дзяцей. «На вашых далікатных плячах, а часам не вельмі, акрамя работы, ляжаць клопаты аб сям'і і дзецях. Пры гэтым вы яшчэ паспяваеце вучыць, лячыць, вырошчваць хлеб, займацца высокім майстэрствам і выхоўваць чэмпіёнаў, якія праслаўляюць Беларусь, ды наглядаць за намі, мужыкамі, каб мы не сышлі з лініі», — дадаў Прэзідэнт.

Ён напрасіў мужчын з вялікімі зоркамі на плячах не крыўдзіцца на яго, заўважыўшы, што жанчына спрадвеку ў любога народа, у любой культуры была ў цэнтры. Таму ў нашай краіне, падкрэсліае Прэзідэнт, такое трапяткое стаўленне да маці, жонак, сясцёр, дачок, а таксама да сям'і і дзяцей.

«І гэта адна з асноў, я нават сказаў бы, фундаментальная апора грамадства. І гэты фундамент мы забетанавалі ў новай Канстытуцыі нашай краіны. Але мы адстойвалі і будзем адстойваць свае традыцыі, як і зрабілі гэта, прыняўшы абноўленую Канстытуцыю», — сказаў беларускі лідар.

Па словах Аляксандра Лукашэнкі, як памяць продкаў, гераічную гісторыю, беларусы будуць берагчы славянскае братэрства. І гэтая місія без мужчын немагчыма ва ўсіх сэнсах.

«Гучыць асабліва і вельмі актуальна. Вам, мужыкі, кажу проста. Няма больш пачэснай прафесіі, чым бараніць Айчыну, служыць краіне і свайму народу. Уручаючы генеральскія пагоны і заслужаныя ўзнагароды, хачу яшчэ раз падзякаваць вам, а ў вашай асобе ўсяму нашаму войску і сілавым структурам, за службу нашай Радзіме», — акцэнтаваў Прэзідэнт.

Ён павіншаваў прысутных з заслужанымі ўзнагародамі і званнямі, падзякаваў ім за ўсё, што робяць для краіны і народа.

«Няхай заўсёды будзе лад у сем'ях, парадак на рабоце і спакой у душы. Няхай вас цешаць дзеці, доўга жывуць бацькі і ва ўсім спадарожнічае поспех. Нам прыгожае, добрае, вясенняе свята цяпер вельмі неабходнае ў гэтыя напружаныя часы. Таму жадаю ўсім, асабліва нашай гераічнай палове грамадства з далікатнымі плячыма, здароўя, міру і дабра», — адзначыў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы падзяліўся, што шматдзетныя маці выглядаюць вельмі юнымі і прыгожымі — складана ўявіць, што яны нарадзілі столькі дзяцей. «Вось з каго нам неабходна браць прыклад», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка.

Ён распавёў: нягледзячы на няпростыя часы для краіны, ён у вельмі добрым настроі з-за надыходзячага свята.

«Вы бачыце: з усіх бакоў нас спрабуюць укусіць, можна сказаць, калі ўжо ваенныя тут. Мы ўсё бачым, мы разгадалі іх задумы. Вы, чытаючы ўсялякія каналы, пісьмы, што вам дасылаюць, — прачыталі і забылі. Вы павінны ведаць, што самае каштоўнае для мяне як Прэзідэнта — вы і вашы дзеці», — расставіў акцэнты Аляксандр Лукашэнка.

Ён дадаў, што з уласнага вопыту ведае, колькі значаць для бацькоў дзеці, і яны павінны жыць у мірнай краіне.

«Нас вельмі хочуць заштурхнуць на вайну ва Украіне. Спецыяльна, каб мы агалілі нашы граніцы. А потым з намі разбярууца хутка. Мы нават з Украіны не паспеем вярнуцца, каб вас абараніць. Гэта тактыка, а стратэгія ў іх — разабрацца з Расіяй і намі заадно», — расказаў Прэзідэнт.

Паводле яго слоў, вакол нашай краіны шмат фэйкаў і хлусні, колькасць якой будзе павялічвацца. «Мы не збіраемся ўлазіць у нейкае дзярмо. У трэці раз пра гэта публічна кажу. Але калі яны ўлезуць, мала не пакажацца. Мы да гэтага гатовыя. Мы будзем змагацца і паміраць за вас на нашай зямлі. У гэтым вы можаце не сумнявацца. Гэта галоўнае, з чым вы можаце прыехаць дамоў адсюль, з цэнтра нашай дзяржавы», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

Ён рэзюмаваў, што Беларусь не хоча скандалаў, канфліктаў і вайны. «Мы людзі мірныя і хацелі б, каб вакол нас быў мір. Гэта мы і робім. Рабіце сваю справу, займайцеся сваёй справай, хто хоча, нараджайце дзяцей, выхоўвайце дзяцей. Мы будзем вам у гэтым дапамагаць у нашай мірнай і незалежнай Беларусі», — рэзюмаваў Прэзідэнт.

**Марыя ДАДАЛКА.**

# На высокім арганізацыйным узроўні

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Кіраўнік Цэнтрвыбаркама адзначыў, што пасля прыняцця змяненняў і дапаўненняў у Канстытуцыю будзе праведзена сур'ёзная карпатлівая работа над заканадаўчай, нарматыўна-прававой базай. Адпаведныя змены зведае і Выбарчы кодэкс.

Падводзячы вынікі важнай грамадска-палітычнай падзеі, Ігар Карпенка паведаміў, што мелі месца факты ўздзеяння на членаў камісій па правядзенні рэферэндуму, спроба зрыву рэферэндуму шляхам ілжывага інфармавання аб пераносе галасавання, нанясенне шматлікіх надпісаў на будынкі і расклейванне лістовак, якія аказвалі ціск на валевыяўленне грамадзян. «Дакладнае, арганізаванае ўзаемадзеянне з органамі ўнутраных спраў і падраздзяленнямі МНС забяспечыла бяспеку падчас правядзення рэферэндуму і не дазволіла дэструктыўным сілам выканаць задуманае, — акцэнтаваў увагу кіраўнік ЦВК. — Таксама дакладнае ўзаемадзеянне з органамі аховы здароўя дазволіла выканаць санітарна-эпідэміялагічныя патрабаванні».

**Сакратар Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў Алена БАЛДОЎСКАЯ** агучыла наступныя даныя, якія датычацца рэферэндуму. Агульная колькасць грамадзян, якія маюць права ўдзельнічаць у рэферэндуме, склала 6 мільёнаў 815 тысяч 635 чалавек. У галасаванні прынялі ўдзел 5 мільёнаў 359 тысяч 403 чалавекі. Такім чынам, яўка склала 78,63 % ад агульнага спіса грамадзян, якія маюць права ўдзельнічаць у рэферэндуме. З іх датэрмінова прагаласавалі 2 мільёны 922 тысячы 738 чалавек. Па месцы знаходжання ў рэферэндуме ўдзельнічалі 336 тысяч 159 выбаршчыкаў. У памяшканні ўчастка для галасавання ў дзень рэферэндуму прагаласавалі 2 мільёны 100 тысяч 506 чалавек.

За прыняцце змяненняў і дапаўненняў да Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь прагаласавалі 4 мільёны 440 тысяч 830 грамадзян, што склала 82,86 % (або 65,16 % ад унесеных у спісы для галасавання). «Супраць» прыняцця змяненняў і дапаўненняў прагаласавалі 684 тысячы 946 удзельнікаў рэферэндуму, што складае 12,78 %. Як паведамілі ў Цэнтральнай выбарчай камісіі, несапраўднымі прызнана 4,36 % бюлетэняў.

**Вераніка КАНЮТА.**

Спорт і палітыка

# ХУТЧЭЙ, ВЫШЭЙ, МАЦНЕЙ, АЛЕ НЕ РАЗАМ

## Высокія спартыўныя ідэі аказаліся прыгожымі толькі на словах

**Наколькі б лепшым быў свет і наколькі лягчэй бы ў ім жылося, калі б спрэчкі і баталіі разгортваліся толькі на спартыўных арэнах. Але, на жаль, галоўныя спаборніцтвы праходзяць на палітычных пляцоўках. А спорт выступае ў якасці пацарпелага. Прычым па злой іроніі лёсу церпяць і тыя, каго жыццё і так не шкадавала.**

У сераду, 2 сакавіка, Міжнародны паралімпійскі камітэт (МПК) прыняў рашэнне, што прадстаўнікі Беларусі і Расіі змогуць выступаць на Паралімпійскіх гульнях у Пекіне ў нейтральным статусе — пад сцягам МПК, без дзяржаўных сімвалаў на экіпіроўцы, гімна на цырымоніі ўзнагароджання. Таксама вынікі спартсменаў не ўлічваліся б у неафіцыйным медальным заліку. Не самы прыемны сцэнарый. Але галоўнае — удзел.

Але раніцай 3 сакавіка стала вядома: беларускія і расійскія паралімпійцы ўвогуле не будуць выступаць на Гульнях. Эндру Парсанс, прэзідэнт МПК, заявіў, што некалькі спартсменаў і каманд пагражаюць не ўдзельнічаць у спаборніцтвах разам з беларусамі і расіянамі. Паводле яго слоў, гэта ставіць пад пагрозу жыццяздольнасць Паралімпійскіх гульняў 2022 года ў Пекіне. Таксама МПК заявіў, што ў алімпійскіх вёсках абвастраецца атмасфера, і гарантаваць бяспеку ўсіх удзельнікаў становіцца немагчыма. «У мэтах захавання цэласнасці гэтых Гульняў і бяспекі ўсіх удзельнікаў мы прынялі рашэнне адмовіць у рэгістрацыі спартсменам ад Паралімпійскага камітэта Расіі і Нацыянальнага паралімпійскага камітэта Беларусі», — удакладніў Эндру Парсанс.

Можна мець розныя палітычныя погляды, абсалютна па-рознаму ставіцца да таго, што адбываецца ў свеце. Але немагчыма не захапляцца сілай духу і характарамі паралімпійцаў. Іх не трэба шкадаваць — ім неабходна даць магчымасць адчуць сябе такімі ж спартсменамі, як і ўсе, здольнымі на рэкорды, на медалі. І нават не дзеля іх краін, не дзеля гімнаў і сцягаў. А толькі дзеля іх саміх, іх самаацэнкі, адносін са светам. Сутнасць паралімпійскага спорту — у самарэалізацыі і сацыяльнай адаптацыі людзей з асаблівасцямі здароўя. Відаць, Міжнародны паралімпійскі камітэт пра гэта забыўся.

Беларуская паралімпійская дэлегацыя, у складзе якой 12 спартсменаў, толькі па дарозе ў Пекін пераадолела столькі, што ўжо вартая ўзнагароды. Планавалася, што з Мінска яны вылецяць 24 лютага, але змаглі вылецець толькі 27-га. З прычыны закрыцця паветранай прасторы над Украінай да Стамбула праз Казахстан ляцелі шэсць гадзін. І там яшчэ 11 гадзін чакалі самалёт на Пекін. Затым яшчэ дзевяць гадзін палёту, чатыры гадзіны дарогі з Пекіна ў лыжны кластар Чжанцзякоў. І ўсё гэта, каб правесці некалькі трэніровак і дачакацца, што галоўных стартаў не будзе. А колькі гадзін дагэтуль яны правялі на трэніроўках, колькі выцерпелі болю і колькі праявілі мужнасці...

Прынцып «спорт па-за палітыкай» застаўся на ўзроўні прыгожай мары барона П'ера дэ Кубертэна, адраджальніка сучаснага алімпійскага руху. Але вялікая сіла спорту, якая аб'ядноўвае людзей з усяго свету, пакуль застаецца рэальнасцю. Успомніць хоць бы абдымкі сярэбранага і бронзавага прызёраў Алімпійскіх гульняў у Пекіне, фрыстайлістаў Ільі Бурава і Аляксандра Абраменкі. Ілья Бураў — расіянін, Аляксандр Абраменка — украінец, але гэта не перашкаджае ім сябраваць.

Спартыўнае адзінства падкрэсліла і камісія спартсменаў Нацыянальнага алімпійскага камітэта. Камісія выказала катэгарычную нязгоду з заклікамі выканкама Міжнароднага алімпійскага камітэта адхіліць атлетаў ад удзелу ў міжнародных спаборніцтвах, не выкарыстоўваць беларускі дзяржаўны сцяг і гімн.

«Спартыўныя спаборніцтвы заўсёды служылі сімвалам аб'яднання атлетаў усіх краін у сумленнай і раўнапраўнай барацьбе, і нікалі не менавіта ідэя мерацца сіламі ў спартыўных спаборніцтвах насуперак усім геапалітычным рознагалоссям і стварыла алімпійскі рух. Заклікаем усю міжнародную спартыўную супольнасць прадухіліць распальванне варожасці, злосці і нянавісці ў рамках спартыўнай грамадскасці і служыць прыкладам згуртаванасці і міралюбнасці», — сказана ў заяўленні Камісіі спартсменаў НАК Беларусі.

На жаль, несці пакаранне за тое, у чым яны невінаватыя, будуць не толькі паралімпійцы. Міжнародны алімпійскі камітэт заклікаў міжнародныя федэрацыі па відах спорту выключыць беларускіх і расійскіх спартсменаў са сваіх стартаў ці дазволіць ім выступаць толькі ў нейтральным статусе.

Летам 2021 года ўпершыню ў гісторыі выканкам МАК змяніў алімпійскі дэвіз. Да знакамітага. Новы дэвіз «Хутчэй, вышэй, мацней — разам!» павінен адлюстроўваць сілу спорту, якая аб'ядноўвае людзей з усяго свету, у супрацьстаянні ўсім выклікам і цяжкасцям. Ідэя, канешне, прыгожая, але яе рэалізацыя выклікае пытанні.

Няхай спорт сёння не можа быць па-за палітыкай, але ён не можа быць па-за чалавечнасцю. Інакш які тады ў ім сэнс?

**Валерыя СЦЯЦКО.**

## Важна, каб ніводзін трэнер і спартсмен не пацярпелі

У штаб-кватэры Нацыянальнага алімпійскага камітэта Рэспублікі Беларусь прайшло сумеснае пасяджэнне НАК Беларусі, Міністэрства спорту і турызму з федэрацыямі па відах спорту. На парадку дня — далейшае развіццё беларускага спорту ва ўмовах беспрэцэдэнтнага ціску з боку Міжнароднага алімпійскага камітэта і міжнародных федэрацый.

«Наша задача — данесці да сусветнай спартыўнай грамадскасці: маўчаць мы не будзем. У існуючых умовах нам неабходна зрабіць шэраг крокаў, каб захаваць і развіваць спорт, выбудаваць адносіны з дружалюбнымі федэрацыямі іншых краін», — заявіў прэзідэнт НАК Беларусі Віктар Лукашэнка.

Міністр спорту і турызму Сяргей Кавальчук падкрэсліў, што ціск на НАК Беларусі ўзмацняецца з кожным днём. Ён заявіў, што беларускія спартсмены не парушылі ні адной прававой нормы. Таму ў самыя кароткія тэрміны неабходна атрымаць ад міжнародных федэрацый падрабязныя тлумачэнні, чаму вынесены такія рэкамендацыі.

«Неабходна весці пастаянную тлумачальную работу з атлетамі. Спартсмены павінны цвяроза глядзець на сітуацыю. У існуючых умовах важна, каб ніводзін наш трэнер і спартсмен не пацярпелі. Атлеты павінны разумець: іх інтарэсы не будуць ушчэмлены. У дзяржавы ёсць неабходныя рэсурсы, прадугледжана фінансаванне, каб усё правільна арганізаваць», — падкрэсліў Сяргей Кавальчук.

Па словах міністра, ужо актыўна прапрацоўваюцца пытанні аб сумесных зборах, турнірах з федэрацыямі па відах спорту Расіі, аператыўна змяняецца каляндар спаборніцтваў. Напрыканцы сакавіка плануецца пашыранае пасяджэнне калегіі Міністэрства спорту Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі, дзе будуць абмеркаваны пытанні ўзаемадзеяння ў спартыўнай сферы. Пакуль жа беларускія атлеты будуць выступаць на міжнародных стартах, на якіх атрымліваюць запрашэнні.

Нашы каштоўнасці

# У ПРЫЯРЫТЭЦЕ — ТАЛЕРАНТНАСЦЬ І ЎЗАЕМНАЯ ПАВАГА

**На пасяджэнні калегіі апарату Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцяў з удзелам старшыні Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі Палаты прадстаўнікоў Генадзя Давыдзькі, начальніка галоўнага ўпраўлення інфармацыйнай палітыкі і грамадскага развіцця Адміністрацыі Прэзідэнта Тацяны Шэндзік падвялі вынікі работы за мінулы год і акрэслілі задачы на бягучы.**

У 2021 годзе мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы ўлады ўзаемадзейнічалі з рэлігійнымі арганізацыямі і нацыянальна-культурнымі грамадскімі аб'яднаннямі, аказвалі ім садзейнічанне ў вырашэнні сацыяльна значных пытанняў у адпаведнасці з заканадаўствам аб свабодзе сумлення і рэлігійных арганізацыях, аб нацыянальных меншасцях.

Як адзначыў **Упаўнаважаны па справах рэлігій і нацыянальнасцяў Аляксандр РУМАК**, на 1 студзеня 2022 года ў краіне зарэгістравана 25 канфесій і рэлігійных напрамкаў. Агульная колькасць рэлігійных арганізацый перавышае 3,5 тысячы, з іх 3409 рэлігійных супольнасцяў, а таксама 173 рэлігійныя арганізацыі, якія маюць агульнаканфесійнае значэнне. У іх ліку 49 рэлігійных аб'яднанняў, 36 місій, 45 манастыроў, 16 братэрстваў, 9 сястрынстваў, 18 духоўных навучальных устаноў. На тэрыторыі краіны дзейнічае 2829 культавых будынкаў розных канфесій, яшчэ 201 у цяперашні час будуецца.

— Прыярытэтным кірункам дзяржаўнай палітыкі ў этнаканфесійнай сферы з'яўляецца падтрыманне ў грамадстве адносін талерантнасці і ўзаемнай павагі, спыненне любых праяў дыскрымінацыі па рэлігійнай ці нацыянальнай прыкмеце і звязанай з гэтым нецярпімасці, — падкрэсліў Аляксандр Румак.

У Беларусі пражываюць людзі 156 нацыянальнасцяў. На 1 студзеня бягучага года зарэгістравана 205 грамадскіх аб'яднанняў і іх арганізацыйных структур 25 нацыянальных супольнасцяў. Усе яны маюць значны досвед культурна-асветніцкай, адукацыйнай, інфармацыйнай і дабрачыннай дзейнасці.

У межах узаемаадносін беларускай дзяржавы з суайчыннікамі, якія пражываюць за мяжой, ажыццяўляліся мерапрыемствы падпраграмы «Беларусы ў свеце» Дзяржаўнай праграмы «Культура Беларусі» на 2021—2025 гады.

У 2021 годзе дзевяці рэгіёнам Беларусі ўручаны дыпломы ў рамках праекта «Адміністрацыйны рэгіён Беларусі — арганізацыя суайчыннікаў за мяжой», сем узнагароджаны Ганаровымі граматамі ўпаўнаважанага.

У бягучым годзе па-ранейшаму асноўнымі задачамі з'яўляюцца далейшае развіццё супрацоўніцтва з рэлігійнымі арганізацыямі, нацыянальна-культурнымі грамадскімі аб'яднаннямі і суайчыннікамі, якія пражываюць за мяжой, на аснове нацыянальных каштоўнасцяў беларусаў, патрыятычнае выхаванне моладзі, папярэджанне парушэнняў заканадаўства рэлігійнымі арганізацыямі і нацыянальна-культурнымі грамадскімі аб'яднаннямі падчас рэалізацыі статутных задач і патрабаванняў.

Падчас калегіі былі разгледжаны досвед работы Бераставіцкага райвыканкама Брэсцкай вобласці па рэгуляванні этнаканфесійнай сферы ў гэтым рэгіёне і супрацоўніцтва з рэлігійнымі арганізацыямі ў сацыяльнай сферы. Узаемадзеянне Рагачоўскага райвыканкама Гомельскай вобласці з Беларускай праваслаўнай царквой па патрыятычным, духоўна-маральным выхаванні насельніцтва і захаванні гістарычнай памяці можа стаць добрым прыкладам для астатніх рэгіёнаў. Гэтак жа, як і сістэма работы мясцовых органаў улады Глыбокскага райвыканкама Віцебскай вобласці па рэалізацыі дзяржаўнай палітыкі ў этнакультурнай сферы і супрацоўніцтве з суайчыннікамі за мяжой. Прыкладам з'яўляецца і работа па падрыхтоўцы і рэалізацыі рашэнняў у этнаканфесійнай сферы мясцовых органаў улады Брэсцкага раёна.

**Алена КРАВЕЦ.**

На слыху

# Мірны малюнак на памяць

**Выпіска з бальніцы, падарункі ад неабыякавых людзей і магчымасць разам з мамай яшчэ застацца «пагасціць» у Беларусі... Сямігадовы Улад — украінскі хлопчык, якога ў гэты панядзелак у цяжкім стане маці перанесла праз беларуска-ўкраінскую граніцу і папрасіла дапамогі медыкаў, — пайшоў на папраўку. Гомельскія ўрачы аказалі малому ўсю неабходную дапамогу. Сям'ю ўжо выпісалі з бальніцы. Маці з сынам пакуль застануцца на тэрыторыі Беларусі.**

— Урачы вельмі клапатліва паставіліся да сына, не адыходзілі ад яго ложка, — усхвалявана выказвае ўдзячнасць падчас выпіскі з гомельскай медустановы Кацярына.

Жыхарка Украіны, маці Улада, якая знаходзілася з дзіцем у бальніцы, пакуль не дзеліцца з журналістамі, пры якіх умовах яна была вымушаная шукаць ратавання сына ў Беларусі. Вядома, што маладая маці і яе сын прыехалі з Чарнігаўскай вобласці. Калі сямігадоваму Уладу раптоўна стала дрэнна, звярнуцца на радзіме па медыцынскую дапамогу не было ніякай магчымасці.

Нягледзячы на адсутнасць неабходных для перасячэння беларуска-ўкраінскай граніцы дакументаў, маці з хлопчыкам не толькі прапусцілі на тэрыторыю Гомельшчыны, але і выклікалі для грамадзян Украіны рэанімобіль. Хлопчыка накіравалі ў Гомельскую абласную інфекцыйную бальніцу. За суткі яго стан стабілізаваўся. Ён нават паспеў пасябраваць з іншымі маленькімі пацыентамі.

Аб гэтай сустрэчы **гомельскаму ўрачу Тацццяне МІХЕД** цяпер будзе нагадваць малюнак, які Улад пакінуў у падарунак. Загадчыца аддзялення Гомельскай абласной інфекцыйнай клінічнай бальніцы Тацццяна Міхайлаўна дзеліцца, як аказвалася меддапамога. Адчуваецца, што яна моцна перажывае за хлопчыка:

— Ён амаль суткі знаходзіўся пад кропельніцай, атрымліваў і сімптаматычнае лячэнне. Пры гэтым у хлопчыка была даволі моцная эмацыянальная перагрузка, калі можна так выказацца. Ён быў надзвычай напалоханы. Даволося працаваць з ім практычна 24 гадзіны на суткі, таму што ён не падымаўся з ложка, амаль увесь час хаваўся пад коўдру, палохаўся ўсяго і ўсіх. За суткі змянілася дынаміка стану здароўя. Цяпер ён вясёлы, рады падарункам...

Перад выпіскай у бальніцы Улада і яго маці праведалі супрацоўнікі Гомельскай абласной арганізацыі Беларускага Чырвонага Крыжа. Перадалі хлопчыку пажаданні не хварэць, уручылі падарункі. У Гомельскай абласной арганізацыі таварыства адзначылі: «Улад падзяліўся, што самаадчуванне і настрой у яго добрыя, яму вельмі спадабаўся доктар».





По заканадаўстве нашай краіны замежныя грамадзяне, што часова прыехалі ў Беларусь, маюць права заставацца на тэрыторыі краіны да 90 сутак на год. Потым у кожным канкрэтным выпадку вызначаецца іх далейшы статус.

Між тым, супрацоўнікі Гомельскай абласной арганізацыі Беларускага Чырвонага Крыжа сёння рыхтуюцца аказваць усю неабходную падтрымку жанчынам з дзецьмі, якія напярэдадні прыбылі на Гомельшчыну з Украіны.

Як паведаміў журналістам **начальнік арганізацыйна-кадравага аддзела Гомельскай абласной арганізацыі Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа Арцём КАРПЕНКА,** БЧК выконвае сваю місію ў адпаведнасці з усімі прынцыпамі арганізацыі незалежна ад палітычных, рэлігійных поглядаў атрымальнікаў дапамогі.

— Калі чалавек мае патрэбу ў дапамозе, мы заўсёды гатовыя прыйсці і падтрымаць. І сёння людзі апынуліся ў цяжкай жыццёвай сітуацыі, прыбылі ў нашу краіну і на гэты момант маюць патрэбу ў нашай дапамозе, — падкрэсліў Арцём Карпенка. — Мы падрыхтавалі і перадалі харчовыя наборы, сродкі гігіены. Далей будзем вывучаць патрэбы сем'яў, па меры таго як яны будуць асвойвацца.

Гомельская абласная арганізацыя Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа сочыць і за іншым праблемным момантам, — ці не патрэбная дапамога яшчэ адным «заложнікам сітуацыі». Гаворка пра стыхійныя лагеры-стаянкі ўкраінскіх велікагрузаў, якія чакаюць магчымасці вяртання дадому.

Вядома, што на дадзены момант утварылася адразу некалькі такіх стаянак. Частка велікагрузаў знаходзіцца на аўтазапраўцы паблізу пагранперахода Новая Гута. Як хутка вырашыцца пытанне па вяртанні дальнабойшчыкаў на радзіму, пакуль невядома. Але адметна, што аказаць усю неабходную падтрымку ўкраінскім кіроўцам, якія затрымаліся на граніцы, выклікалася група беларускіх дальнабойшчыкаў. Грамадзянам Украіны прапанавалі больш камфортныя ўмовы для начлегу і харчавання.

— Прыехаў у Беларусь 23-га, было ўсё добра, выгрузіўся ў Мінску, ужо калі пачалася вайна, — не можа схаваць эмоцый дальнабойшчык з Украіны Сяргей. Кажа, што вельмі ўдзячны ўсім гамяльчанам за падтрымку, але, безумоўна, усе мары аб тым, каб хутчэй убачыць родных.

А гамяльчане стварылі чат «Дапамога ўкраінскім дальнабойшчыкам у РБ», у якім ужо больш за 500 удзельнікаў, гатовых аказваць любую дапамогу: ад прадуктаў харчавання да выдзялення жылля.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

Спажывец

# «Сочым, каб цэны былі адэкватныя»

**Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю ўважана падыходзіць да рэгулявання цэн з улікам рызык і хутка рэагуе на сітуацыю. Аб гэтым заявіў карэспандэнту БелТА міністр антыманапольнага рэгулявання і гандлю Аляксей БАГДАНАЎ.**

«У нас узважаны падыход да фарміравання цэнавай палітыкі. Улічваем усе рызыкі і хутка рэагуем на сітуацыю. Арыентуемся на тое, каб цана на паліцах магазіна была адэкватнай і справядлівай, каб пакупнік мог купіць тавар, а вытворца і прадавец маглі зарабіць», — сказаў Аляксей Багданаў.

Ён адзначыў, што цяпер у Беларусі дзейнічаюць розныя формы цэнавага рэгулявання. Так, пастанова ўрада ад 23 лютага 2021 года № 100 прадугледжвае жорсткія меры рэгулявання цэн на сацыяльна значныя тавары першай неабходнасці. З 15 снежня 2021 года жорсткае рэгуляванне цэн распаўсюджваецца на 29 пазіцый сацыяльна значных тавараў (сырод іх — мука, ячныя крупы, хлеб, ялавічына, свініна, курыца, малако, кефір, смятана, тварог, некаторыя віды садавіны і гароднiны, цукар і інш.), а таксама 50 пазіцый лекавых сродкаў.

«Таксама захоўваецца сацыяльная накіраванасць: дзейнічаюць 10-працэнтныя скідкі для ўразлівых слаёў насельніцтва. Гандлёвыя арганізацыі пайшлі насустрач МАРГ і не збіраюцца адмаўляцца ад дамоўленасцяў»,— падкрэсліў міністр. Зніжка даецца пенсіянерам, інвалідам, шматдзетным сем'ям і малазабяспечаным слаям насельніцтва. У ліку тавараў, на якія яна распаўсюджваецца, — хлеб, мука, аўсяныя шматкі, ячныя крупы, сухія макаронныя вырабы, ялавічына, свініна, курыца, малако, кефір, смятана, тварог, яйкі, яблыкі, агародніна і іншыя тавары. Да пагаднення далучыліся 17 гандлёвых сетак.

Блізкая ўлада

# Выканкамы на сувязі

**Практыка правядзення прамых ліній рэгіянальнай вертыкаллю працягваецца. Калі ў вас ёсць пытанні або праблемы, якія патрабуюць умяшання органаў улады, тэлефануйце.**

Тэлефонныя лініі ў суботу, **5 сакавіка**, з 9.00 да 12.00 праводзяць:

- кіраўнік спраў Брэсцкага аблвыканкама Сяргей Мікалаевіч ЛАБАДЗІНСКІ. Тэл. 8 016 221 31 21;
- намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Барыс Сяргеевіч ЯФРЭМАЎ. Тэл. 8 021 222 22 22;
- першы намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Дзмітрый Іванавіч КОЗЕЛ. Тэл. 8 023 233 12 37;
- старшыня Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў Ігар Георгіевіч ЖУК. Тэл. 8 015 273 56 44;
- намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Сяргей Мікалаевіч МАСЛАЎ. Тэл. 8 022 250 18 69;
- кіраўнік спраў Мінскага аблвыканкама Уладзімір Аляксандравіч ГУРЫНОВІЧ. Тэл. 8 017 500 41 60;
- намеснік старшыні Мінскага гарвыканкама Надзея Анатольеўна ЛАЗАРЭВІЧ. Тэл. 8 017 222 44 44.

Грошы

# ЗДЫМАЦЬ НАЯЎНЫЯ З КАРТАК ЗУСІМ НЕ АБАВЯЗКОВА

## У цяперашняй сітуацыі Беларусбанк вырашыў супакоіць кліентаў і праінфармаваў іх аб рабоце сваіх плацежных картак

**У заяве гэтага фінансавага інстытута гаворыцца, што банк «ажыццяўляе дзейнасць у штатным рэжыме, аказваючы неабходны спектр банкаўскіх паслуг для кліентаў і партнёраў. Аперацыі з фізічнымі асобамі па плацежных картках праводзяцца ў штатным рэжыме». Спецыялісты дадзенай фінансавай установы запэўніваюць, што карткі, эмітаваныя банкам, працуюць без абмежаванняў на тэрыторыі нашай краіны і замежных дзяржаў.**

Разам з тым у цяперашні момант у прыладах асобных банкаў могуць быць недаступныя аперацыі аплаты і зняцця наяўных з выкарыстаннем сэрвісаў Apple Pay, Samsung Pay, Кашалёк Pay, Garmin Pay, Huawei Pay, Fitbit Pay.

Прэс-служба Беларусбанка адзначае, што ў падобных сітуацыях для правядзення плацяжоў можна скарыстацца фізічнай плацежнай карткай, эмітаванай банкам.

**«Белінвестбанк»** адказаў на ўсе актуальныя пытанні аб дзеянні картак, зняцці наяўных, абмене валют, грашовых пераводах, крэдытаванні, рахунках і укладах. З такімі цяжкасцямі, відаць, сутыкнуліся ўсе банкі краіны (ці амаль усе).

У прэс-службе гэтага акцыянернага таварыства адзначылі, што абмежаванні, прынятыя ў дачыненні да банка, былі чаканыя, розныя сцэнарыі пераадолення наступстваў прапрацоўваліся спецыялістамі загадзя.

На тэрыторыі нашай краіны ўсе карткі «Белінвестбанка» працягваюць працаваць. Па-ранейшаму можна разлічвацца імі і здымаць наяўныя. Разам з тым у сувязі з абмежаваннямі плацежных сістэм Visa і Mastercard па дадзеных картках «Белінвестбанка» недаступныя плацяжы ў анлайн-сэрвісах, такіх як Яндэкс, OZON, Wildberries, AliExpress і іншых, а таксама з выкарыстаннем такенізаваных картак Mastercard і Visa ў кашальках Apple Pay, Кашалёк Pay, Samsung Pay, Xiaomi Pay, Garmin Pay, Fitbit Pay, «Аплаці». Банк рэкамендуе выкарыстоўваць для разлікаў у гандлёвых кропках на тэрыторыі Беларусі плацежныя карткі на фізічных носьбітах, а пры разліках з дапамогай «Аплаці» — QR-код.

Выкарыстанне картак Mastercard і Visa «Белінвестбанка» за мяжой немагчымае, як і аплата на згаданых картках на замежных сайтах. Усе апісанныя вышэй асаблівасці датычацца і карпаратыўных картак «Белінвестбанка» Mastercard Business, Visa Business, Visa Platinum Business.

Тым, хто плануе ў хуткім часе выезд за межы краіны, рэкамендуецца загадзя зняць неабходную суму наяўных грашовых сродкаў на асабістыя выдаткі.

### АБМЕН ВАЛЮТЫ І АПЕРАЦЫІ З КАШТОЎНЫМІ ПАПЕРАМІ

У «Белінвестбанку» працягваюць ажыццяўляць валютна-абменныя аперацыі ў аддзяленнях банка, у банкаматах з функцыяй cash-in, таксама яны даступныя па каналах дыстанцыйнага абслугоўвання — мабільным дадатку і інтэрнэт-банкінгу.

Аперацыі куплі-продажу каштоўных папер, аказанне паслуг па брокерскай і дэпазітарнай дзейнасці ажыццяўляюцца ў агульнаўстаноўленым парадку.

### ЗНЯЦЦЕ НАЯЎНЫХ

У банку падкрэслілі, што для прадухілення дэфіцыту наяўных грошай банкаматныя сеткі планава загружаюцца наяўнымі грашовымі сродкамі і працуюць у штатным рэжыме. «Калі вы сутыкнуліся з тым, што ў банкамаце адсутнічаюць наяўныя сродкі, проста знайдзіце найбліжэйшы да вас банкамат «Белінвестбанка» або скарыстайцеся прыладамі банкаў-партнёраў для бескамісійнага зняцця наяўных: ААТ «Белаграпрамбанк» і ЗАТ «МТБанк» (па картах Visa і Mastercard). У выпадку калі вы з'яўляецеся трымальнікам карткі JOKER, «Пенсіённай карты», «Экалагічнай карты», «Карты балельшчыка», «Сусветнай Black», Visa Platinum, Visa Infinite альбо пакета «Найлепшыя гады», «Старт», «Стандарт», «Прэміум», «Люкс», VIP, па асноўнай картцы вы зможаце зняць наяўныя грошы без камісіі і ў банкаматах ААТ «ААБ Беларусбанк».



### ГРАШОВЫЯ ПЕРАВОДЫ

У сувязі з уведзенымі абмежаваннямі валютныя пераводы за мяжу недаступныя для кліентаў «Белінвестбанка». Недаступныя і сэрвісы міжнародных пераводаў Western Union і «Залатая Карона».

Пры пераводах па картках Visa і Mastercard магчымыя адмовы ў абслугоўванні. Пераводы ўнутры банка і па тэрыторыі Беларусі даступныя ў поўным аб'ёме ў рублях і ў замежнай валюце.

### КРЭДЫТАВАННЕ

З пачатку сакавіка часова прыпынены прыём заявак ад фізічных асоб на прадастаўленне асобных крэдытных прадуктаў на спажывецкія патрэбы і фінансаванне нерухомасці. На бягучы момант банк прымае ад кліентаў — фізічных асоб заяўкі на прадастаўленне крэдытаў на фінансаванне нерухомасці па Указе Прэзідэнта ад 4 ліпеня 2017 года № 240 «Аб дзяржаўнай падтрымцы грамадзян пры будаўніцтве (рэканструкцыі) жылых памяшканняў» і спажывецкіх крэдытаў на набыццё тавараў айчыннай вытворчасці. А вось крэдытаванне юрыдычных асоб ажыццяўляецца ў звычайным рэжыме.

### РАХУНКІ І ЎКЛАДЫ

У банку падкрэслілі, што ўсе рахункі кліентаў актыўныя, а размешчаныя на іх сродкі даступныя як у аддзяленнях, так і па каналах дыстанцыйнага абслугоўвання ў мабільным і інтэрнэт-банкінгу. Імі можна спакойна распараджацца ў поўным аб'ёме і праводзіць транзакцыі на тэрыторыі Беларусі.

«У мэтах арганізацыі работ па падмацаванні пунктаў продажу неабходным аб'ёмам наяўных сродкаў датэрміновае вяртанне адзыўных укладаў, сродкаў з рахункаў «да запатрабавання» і бягучых рахункаў ажыццяўляецца на падставе папярэдніх заявак, пададзеных у вызначаныя дагаворамі тэрміны. Сродкі выдзяляюцца на працягу 5 дзён з дня прад'яўлення укладчыкам альбо ўладальнікам рахунку пісьмовага патрабавання аб вяртанні», — гаворыцца ў паведамленні.

У банку запэўнілі, што ўведзеныя абмежаванні не закрануць уклады кліентаў у рублях і валюце. «Усе яны даступныя ў поўным аб'ёме — іх можна папаўняць, адкрываць і закрываць. Банк працягвае выконваць усе ўзятыя на сябе дагаворныя абавязацельствы. Акрамя таго, дзяржава гарантуе поўную захаванасць грашовых сродкаў фізічных асоб у беларускіх рублях і замежнай валюце, размешчаных на рахунках і ва ўкладах у банках Беларусі», — падкрэслілі ў прэс-службе «Белінвестбанка».

**Сяргей КУРКАЧ.**

Да ведама

## Крэдыты на жыллё застануцца даступнымі

Літаральна ўчора Беларусбанк прадэманстраваў досыць адказнае стаўленне да сваіх спажыўцоў. Гэтае акцыянернае таварыства лічыць вельмі важным падтрымліваць сваіх кліентаў, аказваць ім усю магчымую дапамогу, забяспечыць індывідуальны падыход да кожнага, што сёння так неабходна ў сітуацыі, якая склалася.

У прэс-службе паведамілі, што банк захоўвае на ранейшым узроўні працэнтныя стаўкі па раней атрыманых крэдытах на фінансаванне нерухомасці. Такім чынам, для кліентаў банка, якія да 01.03.2022 года ўжо афармілі крэдыты на куплю або будаўніцтва жылля, памер плацяжу да канца года не зменіцца, незалежна ад змянення стаўкі рэфінансавання Нацыянальнага банка Беларусі.

Акрамя таго, Беларусбанк, клапоцячыся аб захаванні фінансавага дабрабыту кліентаў, дадаткова прымае шэраг мер, накіраваных на зніжэнне крэдытнай нагрузкі, аб якіх паведаміць у хуткім часе.

Надвор'е

# ХОЛАДНА І СЛІЗКА

### Першая дэкада вясны будзе дастаткова халоднай і нават снежнай

**Апошні месяц зімы быў цёплым, таму мы з вамі чакалі ранняю вясну. Але ў мінулую сераду раніншія снежныя пейзажы за вокнамі кватэр нагадалі, што расслабляцца яшчэ рана. Безумоўна, у сувязі з дадатнымі тэмпературамі паветра такому снежнаму покрыву доўга не пратрымацца, але варта памятаць: сакавік у нашых шыротах часта мае рысы пераходнага месяца, таму яшчэ магчымая неаднаразовая змена надвор'я, у тым ліку і вяртанне маразоў, нагадваюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Так, раніцай у пятніцу за акном будзе зіма: у асобных раёнах краіны пройдуць невялікія кароткачасовыя ападкі, у асноўным снег, мокры снег. Месцамі чакаецца слабы туман. На асобных участках дарог прагназуецца галалёдзіца. Максімальная тэмпература паветра складзе ад мінус 1 градуса да 5 цяпла.

Уначы і раніцай наступнага дня, у суботу, у асобных раёнах краіны пройдзе невялікі кароткачасовы снег, удзень пераважна без ападкаў. На асобных участках дарог чакаецца галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе мінус 1—8 градусаў. Удзень будзе ад мінус 2 да плюс 5 градусаў.

Вельмі холадна на гэтым тыдні будзе ў ноч на 6 сакавіка — у нядзелю пераважна без ападкаў, удзень месцамі ў паўночных раёнах краіны пройдуць невялікія кароткачасовыя ападкі, у асноўным мокры снег. На асобных участках дарог прагназуецца галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе мінус 3—9 градусаў, пры праясненнях да 10—13 градусаў ніжэй за нуль. Удзень будзе ад мінус 1 градуса да 5 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных спецыялістаў, у панядзелак уначы месцамі, а ўдзень над большай часткай тэрыторыі краіны пройдзе кароткачасовы снег і мокры снег. На асобных участках дарог чакаецца галалёдзіца. Тэмпература паветра ноччу складзе мінус 1—7 градусаў, пры праясненнях да 10 марозу. Удзень будзе ад мінус 2 градусаў да 5 цяпла.

У аўторак, на свята прыгожай паловы чалавецтва — 8 Сакавіка, уначы і раніцай на большай частцы тэрыторыі, а ўдзень па паўднёвым усходзе краіны пройдзе кароткачасовы снег, мокры снег. На асобных участках дарог прагназуецца галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе мінус 2—8 градусаў, па поўначы пры праясненнях да 11 марозу. Удзень тэмпература будзе вагацца ад мінус 4 градусаў да 3 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Санкцыі супраць Расіі даюць ЗША магчымасць адняць у яе долю рынку ўзбраенняў

**Улады ЗША лічаць, што ўвядзенне Захадам новых санкцый супраць Расіі ўскладніць ёй продаж узбраенняў іншым краінам, Вашынгтон лічыць гэта спрыяльнай магчымасцю адняць у Масквы долю рынку, заявіў памочнік дзяржсакратара ЗША па справах Паўднёвай і Цэнтральнай Азіі Дональд Лу, паведамляе ТАСС.**

«На маю думку, усім будзе вельмі цяжка купляць асноўныя сістэмы ўзбраенняў у Масквы ў наступныя месяцы і гады, улічваючы маштабныя фінансавыя санкцыі, якія адміністрацыя пры падтрымцы Кангрэса ўвяла супраць расійскай банкаўскай сістэмы», — адзначыў ён.

Дональд Лу лічыць, што многія краіны, у распараджэнні якіх ёсць расійскія ўзбраенні, стануць апасацца. «Апасацца не толькі купіць новыя сістэмы, такія як С-400, але і проста набыць боепрыпасы, камплектуючыя, асноўныя кампаненты для традыцыйных расійскіх сістэм узбраенняў, якія ў іх ужо ёсць», — растлумачыў памочнік дзяржсакратара ЗША.

«Я меркаваў бы, што Індыя ўваходзіць у лік краін, у якой ёсць апасенні адносна гэтага, — дадаў Дональд Лу. — На маю думку, гэта дае магчымасць для ЗША і Еўропы, для многіх краін, якія цяпер распрацоўваюць найноўшыя тэхналогіі ў абароннай сферы, выйсці на новыя рынкі».

### У Арменіі выбралі прэзідэнта

**Парламент Арменіі ў другім туры выбраў міністра высокатэхналагічнай прамысловасці Ваагна Хачатрана прэзідэнтам рэспублікі, паведамляе ТАСС. Ён быў адзіным кандыдатам на пасаду.**

«За кандыдатуру Ваагна Хачатрана прагаласавалі 71 дэпутат, ён выбраны прэзідэнтам Арменіі», — абвясціў в. а. спікера парламента Акоп Аршакян. На пасадзе прэзідэнта Хачатран зменіць Армена Саркісяна, які быў на гэтай пасадзе з 2018 года.

### Катам з РФ забаранілі ўдзельнічаць у міжнародных выставах



**Міжнародная федэрацыя катоў (FIFE) увяла забарону на ўдзел у замежных выставах для катоў з Расіі, паведамляе РІА «Навіны» са спасылкай на расійскае прадстаўніцтва федэрацыі.**

Забарона не распаўсюджваецца на выставы ўнутры краіны, растлумачылі ў прадстаўніцтве. Там таксама дадалі, што федэрацыя забараніла рэгістрацыю ў радаводных кнігах пародзістых катоў, выведзеных у Расіі і набытых замежнымі грамадзянамі.

Як паведамляе агенцтва, на афіцыйным сайце FIFE сцвярджаецца, што абмежаванні будуць перагледжаны «па меры неабходнасці».

***Паважаныя калегі, дарагія ветэраны! Прыміце самыя шчырыя і сардэчныя віншаванні з Днём міліцыі!***

Стаяць на варце законнасці і дапамагаць людзям — нязменныя задачы, якія вось ужо 105 гадоў самаададдана і сумленна выконваюць супрацоўнікі органаў унутраных спраў. Як і на працягу больш чым векавога шляху, сёння міліцыя з'яўляецца магутнай апорай дзяржавы: ставіць жорсткі заслон злачыннасці, абараняе канстытуцыйныя правы і свабоды грамадзян, прыходзіць на выручку тым, хто апынуўся ў бядзе.

Знамянальную дату мы сустракаем у асаблівы час — у Год гістарычнай памяці. Ніхто не можа памяняць мінулае, але ў сілах кожнага паўплываць на будучыню, захоўваючы і перадаючы свае веды аб гераізме нашых папярэднікаў і бязвінных ахвярах вайны. Мы традыцыйна праводзім нямала патрыятычных мерапрыемстваў. Лічаныя дні засталіся да адпраўлення Цягніка гістарычнай памяці, які давязе пасажыраў да Брэста. Гэтая акцыя — сімвал таго, што супрацоўнікі міліцыі ніколі не забудуць вялікі подзвіг савецкага народа, дзякуючы якому мы можам спакойна жыць у сваёй краіне.

Сёння няпросты, насычаны падзеямі і новымі пачынаннямі перыяд. Прыкладзеныя намі цяпер намаганні ў будучыні стануць надзейнай асновай для захавання законнасці і спакою ў дзяржаве. Рашучы адпор у асобе міліцыянераў сустракаюць абсалютна ўсе выклікі прававога парадку. Упэўнены: такія ж прафесіяналізм і самааддачу мы разам будзем дэманстраваць і далей.

У гэты дзень асаблівую падзяку выказваю ветэранам органаў унутраных спраў, чый вопыт незаменны ў выхаванні новых пакаленняў супрацоўнікаў. Вялікую ўдзячнасць таксама адрасую сем'ям вартавых парадку. Дзякуй за разуменне, падтрымку, цеплыню хатняга ачага!

Яшчэ раз шчыра віншую са святам! Жадаю не здаваць дасягнутых вышынь, прафесійнага росту, аперацыйнай удачы, здароўя, мірнага неба і новых поспехаў на карысць Радзімы!

**Міністр унутраных спраў Рэспублікі Беларусь, генерал-лейтэнант міліцыі І. У. КУБРАКОЎ.**



Асоба

**Наталля САХАРЧУК:**

# «Я ПРОСТА ЛЮБЛЮ ЛЮДЗЕЙ»

## Прэс-сакратар міліцэйскага ведамства — пра сямейную дынастыю, тонкасці прафесіі і майстэрства быць жанчынай у любой сітуацыі



**Восенню мінулага года ўпраўленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў МУС узначаліла Наталля САХАРЧУК. Супрацоўнік органаў унутраных спраў амаль з 20-гадовым стажам, афіцэр, вопытны кіраўнік і грамадскі дзеяч, яна ўзялася за давераную ёй справу з вялікай адказнасцю. І з не меншай цікавасцю: Наталлю Міхайлаўну па праве можна назваць журналістам у пагонах — на працягу многіх гадоў падчас сваёй папярэдняй службы яна расказвала пра міліцыю ў радыё- і тэлээфіры, стварала інфармацыйны кантэнт для перыядычных выданняў Брэсцкага рэгіёна. Інакш кажучы, у справе ўзаемадзеяння са сродкамі масавай інфармацыі яна далёка не навічок.**

### З міліцэйскай дынастыі

Наталля Сахарчук — міліцыянер у чацвёртым пакаленні. Пачынальнік дынастыі — яе прадзед, ветэран Вялікай Айчыннай вайны, супрацоўнік Народнага камісарыята ўнутраных спраў. Па яго шляху пайшлі сын і ўнук, дзед і бацька Наталлі Міхайлаўны. Усё іх жыццё звязанае з міліцыяй. Дзед расследаваў эканамічныя злачынствы. Бацька пачынаў з крымінальнага вышуку, службу скончыў начальнікам упраўлення ўнутраных спраў Брэсцкага аблвыканкама. Таму калі брат Наталлі Сахарчук захацеў працягнуць сямейную дынастыю, гэта нікога не здзівіла. А вось калі міліцыянерам вырашыла стаць яна сама, усе, мякка кажучы, былі ў шоку.

Справа ў тым, што доўгі час яна марыла стаць медыкам, як і мама. Дома Наталля была сапраўдным хатнім лекарам: заўсёды ўсіх лячыла. Цікавілася медыцынай, хацела дапамагаць людзям і ратаваць іх. Бацькі былі ўпэўненыя: паступаць дачка будзе ў медыцынскі. Аднак міліцэйскае асяроддзе, у якім яна выхоўвалася, зрабіла сваю справу.

— Калі мой брат паступіў на юрыдычны факультэт, я таксама пачала з ім вучыцца: слухала, што ён расказвае, чытала падручнікі, разам з ім выконвала заданні, — успамінае Наталля Сахарчук. — Агульная тэорыя права, крымінальнае права... Мне стала вельмі цікава. І калі дагэтуль мне падабалася ўсіх лячыць, то пасля я вырашыла, што таксама буду дапамагаць людзям, але ў іншым плане. Тым больш падчас вучобы ў школе я часта выступала ў якасці «адваката», заўсёды ўсіх абараняла.

Калі ў 11 класе дачка аб'явіла аб сваім рашэнні стаць юрыстам, для ўсіх, асабліва для мамы, гэта стала нечаканасцю.

### Пайшла дапамагаць людзям

Пасля школы Наталля Сахарчук паступіла на юрыдычны факультэт Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Пушкіна. «Гэта быў усяго толькі другі набор, — расказвае яна. — Нягледзячы на тое што мы былі першапраходцамі, у нас выкладалі вельмі моцныя спецыялісты. Дзякуючы гэтым прафесіяналам — кандыдатам юрыдычных навук, дацэнтам, людзям, якія служылі ў органах унутраных спраў, — мы атрымалі добрую адукацыю. Сёння амаль усе, хто са мной вучыўся, маюць дачыненне да праваахоўнай сферы».

Скончыўшы ўніверсітэт, яна вырашыла, што павінна ісці дапамагаць людзям. І пайшла ў следства. «Мама была ў разгубленасці: я ёй заўсёды казала, што не пайду працаваць у міліцыю, — расказвае Наталля Міхайлаўна. — Служба кладзе свой адбітак на сямейнае жыццё. Твой бацька суткамі на рабоце, ты яго не бачыш, не чуеш... Пры гэтым я, дарэчы, ніколі не адчувала недахопу бацькавай любові. Дзеці, якія растуць у міліцэйскіх сем'ях, бачаць свет крыху з іншага боку. Супрацоўнік МНС пастаянна ратуе чыёсьці жыццё, пры гэтым рызыкуе сваім. Так і з міліцыянерам — ён рызыкуе, можа трапіць пад кулю. У майго бацькі, які затрымліваў асабліва небяспечных злачынцаў, было не адно раненне...»

Аднак Наталля добра ведала, на што ідзе. Разумела і тое, што можа чакаць яе дзяцей. За свае школьныя гады яна памяняла не адну школу. Дзе толькі ні жылі! Вядома, маці не жадала такога лёсу сваёй адзінай дачцэ. Яна добра разумела, што такое жыццё міліцыянера, асабліва жанчыны, якая носіць пагоны.

— Быць жанчынай-міліцыянерам нашмат больш складана, — перакананая Наталля Сахарчук. — Мужчына прыходзіць з работы, яго дома чакаюць жонка, дзеці, усё чыста, прыгатавана. Жанчыне, якая вярнулася пасля службы дадому, патрэбна прыгатаваць вячэру, зрабіць хатнія справы. А яшчэ нельга забываць пра сваіх блізкіх: якой бы стомленай ты ні прыйшла, трэба ўдзяліць увагу і мужу, і дзецям.

### У адказнасці за іншыя жыцці

Наталлі Сахарчук вельмі падабалася сама працэдура расследавання крымінальнай справы. На той момант, калі яна прыйшла ў міліцыю (а гэта быў 2003 год), прадстаўніц жаночага полу ў следстве фактычна не было. Сёння ўсё дакладна наадварот.

— Работа следчага — складаная, карпатлівая, — лічыць Наталля Міхайлаўна. — Менавіта ад цябе, тваёй рашэння, прафесіяналізму і падыходу да расследавання крымінальных спраў залежыць жыццё іншых людзей. Ты працуеш з абсалютна рознымі людзьмі, у тым ліку з грамадзянамі без пастаяннага месца жыхарства, крымінальнікамі, якія за сваімі плячамі маюць вялікі стаж турэмнага жыцця. Гэта і дзеці, і жанчыны з нізкай сацыяльнай адказнасцю. Адным словам, настолькі разнастайная публіка, не кожная жанчына можа вытрымаць такую нагрузку. А я тады была маладая 23-гадовая дзяўчына, якая толькі прыйшла ў міліцыю...

Якія толькі справы ёй не даводзілася весці... Займалася расследаваннем забойстваў, згонаў аўтамабіляў, злачынстваў, звязаных з цяжкімі цялеснымі пашкоджаннямі. У складаных сітуацыях заўсёды звярталася па параду да бацькі. Вядома, ён вельмі ганарыўся сваёй дачкой і працягвае ганарыцца цяпер. «Ёсць такое меркаванне, што ўсе мужчыны хочуць сыноў, аднак калі ў іх нараджаюцца дочкі, яны іх любяць абсалютна па-іншаму», — кажа Наталля Сахарчук.

### Пра чалавека і чалавечнасць

Калі са следства яна пераходзіла служыць у Дзяржаўную аўтамабільную інспекцыю, вельмі шкадавала пакідаць свой калектыў. Гэта, па словах падпалкоўніка міліцыі, была сям'я, якая заўсёды адзін аднаго падтрымлівала. Аднак і тут з калектывам пашанцавала.

— Нельга стаяць на адным месцы, трэба рухацца наперад, — упэўненая Наталля Сахарчук. — Працаваць з грамадскасцю ў мяне заўсёды атрымлівалася. Я проста люблю людзей.

Наталля Міхайлаўна стала адной з першых жанчын у ДАІ Брэсцкай вобласці. Разам з аднадумцамі яны ўключыліся ў работу па прафілактыцы правапарушэнняў і трагедый на дарогах. Выконвала і абавязкі інспектара дарожнага руху. Дагэтуль памятае свой першы рэйд, падчас якога разам з калегамі склалі 14 пратаколаў на парушальнікаў — дзяўчаты-інспектары правяралі няздобрасумленных кіроўцаў маршрутак.

Акурат у той перыяд ведамства стала вельмі цесна ўзаемадзейнічаць са сродкамі масавай інфармацыі. На радыё «Брэст» з'явілася свая праграма, савядучай якой была Наталля Сахарчук. У прамым эфіры супрацоўнікі міліцыі, а нярэдка і кіраўнікі пэўных падраздзяленняў на зразумелай мове адказвалі на пытанні слухачоў. Затым на мясцовым тэлебачанні з'явілася праграма «Бяспечная дарога», рэйтынг якой таксама быў высокі. Шматлікія акцыі, праекты, мерапрыемствы — імідж ДАІ, увогуле міліцыі Брэстчыны пастаянна павышаўся.

— Я заўсёды прытрымлівалася нестандартных рашэнняў у правядзенні мерапрыемстваў, — заўважае падпалкоўнік міліцыі. — Мне хацелася не проста раздаць людзям флікеры ці нейкія памяткі. Гэта павінна было быць цікава, крэатыўна, з індывідуальным падыходам. Невыпадкова падчас планавання пэўных прафілактычных мерапрыемстваў за аснову я бяру аналіз і прагназаванне. Вядома, усякія сітуацыі бываюць, аднак без гэтага ў нашай прафесіі складана.

Па такім жа прынцыпе будавалася работа і тады, калі Наталля Сахарчук узначаліла аддзел агітацыі і прапаганды ДАІ, потым атрымала каласальны вопыт падчас кіравання штабам, а пасля прэс-службай упраўлення ўнутраных спраў Брэсцкага аблвыканкама. «У мяне заўсёды свая стратэгія, што заключаецца ў тым, каб паказваць работу супрацоўнікаў міліцыі, якія дапамагаюць людзям, абараняюць і ахоўваюць, — расказвае начальнік упраўлення інфармацыі і грамадскіх сувязяў МУС. — Аднак прафілактыку ніхто не адмяняў. Нядаўна міністр унутраных спраў сказаў цудоўныя словы, якія я для сябе ўзяла за аснову: «Лепш спрафілактаваць злачынства, чым потым яго раскрываць».

Усё жыццё Наталля Сахарчук працуе ў мужчынскім калектыве. Аднак, як яна прызнаецца, гэта абсалютна не мае ніякага значэння: калі ты адносішся да людзей з павагай, тады і да цябе будзе такое ж стаўленне.

— Жанчына ў форме выклікае абсалютна іншае ўспрыманне ва ўсіх: як у дзяцей, так і ў дарослых, — адзначае яна. — З любой канфліктнай сітуацыі можна заўсёды знайсці выхад. Нягледзячы на свой статус у грамадстве, да людзей трэба адносіцца па-добраму. Усе пасады і рангі — часовая з'ява. Галоўнае — заставацца чалавекам.

Наталля Міхайлаўна прызнаецца, што ёй лёгка было ўступаць на новую пасаду. «У мяне тут цудоўны калектыў, — прызнаецца кіраўнік прэс-службы ведамства. — Я іх усіх ведала на працягу таго часу, калі працавала ў прэс-службе міліцыі Брэсцкай вобласці. У многіх з іх я вучылася, пераймала вопыт. Акрамя таго, што ўсе яны — прафесіяналы сваёй справы, яны яшчэ і людзі з вялікай літары. А гэта дарагога варта».

### Заставацца жанчынай

Так склалася, што муж Наталлі Сахарчук — таксама супрацоўнік міліцыі. Інакш, напэўна, быць і не магло. Наўрад ці мужчына, які не мае ніякага дачынення да праваахоўнай сферы, зразумее бы такую занятасць сваёй другой палавіны. А гэта і пастаянныя рэйды, і камандзіроўкі, у тым ліку замежныя, і ненарміраваны рабочы дзень, нярэдка бываюць і рабочыя выхадныя.

Аднак нягледзячы на сваю загружанасць, Наталля Сахарчук — цудоўная гаспадыня. «Жанчына заўсёды павінна заставацца жанчынай, — мяркуе яна. — Я, напрыклад, не люблю ежу, якая разаграваецца: усё павінна быць свежае. Дастаткова гадзіны, каб прыгатаваць паўнавартасную вячэру. Сёння для жанчыны ёсць вельмі шмат памочнікаў: пральная машына, робат-пыласос». Дарэчы, з Наталляй Міхайлаўнай жывуць яшчэ два сабакі, якія хоць і дадаюць работы, але і сілы аднаўляюць — падчас зносін з гэтымі чатырохногімі сябрамі нараджаюцца эмоцыі дакладна толькі станоўчыя, а ўсё дрэннае забываецца.

— Кожная жанчына пры ўсёй сваёй занятасці яшчэ павінна і добра выглядаць, — упэўненая Наталля Сахарчук. — Мяне яшчэ ў дзяцінстве мама навучыла: першае, што я павінна зрабіць, калі прачнулася, — памыць твар і прычасаць валасы. І няважна, ідзеш ты сёння на работу або застаешся дома. Гэта тое нямногае, што адрознівае жанчыну ад мужчыны. У астатнім — ніякай гендарнай розніцы. Трэба будзе, яшчэ і самыя першыя пойдзем Радзіму абараняць!

**Вераніка КАНЮТА.**

# У ШКОЛАХ І ПАЛІКЛІНІКАХ, АЛЕ СА ЗГОДЫ БАЦЬКОЎ

### БЕЗ ПАПЯРЭДНЯГА ЗАПІСУ, У ЛЮБЫ ЧАС

— Вакцынацыя — найбольш эфектыўны сродак спецыфічнай прафілактыкі інфекцыйных хвароб. Яна фарміруе індывідуальную засцярогу, папярэджвае ўзнікненне захворвання і яго цяжкі ход, неспрыяльныя наступствы, — нагадвае **намеснік галоўнага ўрача па медыцынскай частцы 25-й сталічнай дзіцячай паліклінікі Людміла ЛАЗАРЧЫК.** — Каранавірус небяспечны не толькі для дарослых, у дзяцей захворванне таксама можа праходзіць цяжка і патрабаваць шпіталізацыі. Акрамя таго, дзеці становяцца крыніцай хваробы для навакольных дарослых.

Як вядома, магчымасць прышчапіцца падлеткам ад 12 да 17 гадоў з'явілася ў снежні 2021 года, бо менавіта гэтая група дзяцей найчасцей уцягваецца ў эпідэмічны працэс. Для вакцынацыі выкарыстоўваецца інактываваная вакцына Vero Cell кітайскай вытворчасці. Прышчэпка робіцца са згоды бацькоў.

У Беларусі ўжо назапашаны пэўны вопыт у прымяненні дадзенай вакцыны ў дарослых. Як адзначае Людміла Лазарчык, у першую чаргу мэтазгодна зрабіць прафілактычныя прышчэпкі найбольш уразлівым катэгорыям дзяцей. Гэта тыя, хто мае парушэнні абмену рэчываў, у прыватнасці, лішнюю вагу, розныя хранічныя хваробы, паталогіі сардэчна-сасудзістай і дыхальнай сістэм. Дзецям, якія перахварэлі на каранавірус, таксама мэтазгодна прайсці курс вакцынацыі, але не раней за шэсць месяцаў пасля выздараўлення. Таксама рэкамендуецца прышчапіць дзяцей, якія цесна кантактуюць з тымі, каму вакцынацыя ў цяперашні час недаступная. Напрыклад, дзеці да 12 гадоў ці з супрацьпаказаннямі да вакцынацыі.

Перад правядзеннем прышчэпкі афармляецца інфармаваная згода бацькоў, дазвол на вакцынацыю дае ўрач пасля медыцынскага агляду, пры адсутнасці супрацьпаказанняў уводзіцца вакцына.

Для прышчэпкі дастаткова прыйсці да свайго ўчастковага ўрача-педыятра. Таксама можна на працягу ўсяго дня звярнуцца для агляду да ўрача, які замацаваны за прышчэпачным кабінетам.

— Можна нават не запісвацца, вакцынацыя ад каранавіруснай інфекцыі ў цяперашні час вельмі даступная. У некаторых выпадках можна прышчапіцца разам з бацькамі — мы вакцынуем і дарослых пры жаданні, — кажа намеснік галоўнага ўрача.

Пры гэтым, адзначаюць медыкі, ім хацелася б бачыць больш актыўную пазіцыю бацькоў: калі прышчапіліся самі, то і дзіця не пажадана пакідаць не абароненым ад інфекцыі.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

### У ШКОЛЕ: БЕЗ ЧАРГІ І З АГЛЯДАМ УРАЧА

Зрабіць прышчэпку можна і ў навучальнай установе — школе ці каледжы. Гэта эканоміць час, бо не трэба лішні раз ісці ў паліклініку.

На базе 25-й дзіцячай паліклінікі абслугоўваецца 10 школ і адзін прафесійна-тэхнічны каледж, а гэта 11,5 тысячы дзяцей. Урачы паліклінікі замацаваныя за кожнай навучальнай установай, акрамя таго, у кожнай з іх ёсць медработнік. Яны інфармуюць класных кіраўнікоў і куратараў груп аб вакцынацыі. Тыя, у сваю чаргу, раздаюць інфармацыю ў пісьмовым выглядзе кожнаму падлетку. Бацькі маюць магчымасць азнаёміцца з правіламі вакцынацыі і парадкам яе правядзення.

— Школьныя медыцынскія кабінеты, згодна з загадам, аснашчаны ўсім неабходным, гэтак жа, як і працэдурны кабінет у паліклініцы. У кожным ёсць халадзільнікі, у іх устаноўлены тэрмометры, бо розныя вакцыны патрабуюць розных тэмператур захоўвання. Для выканання санэпідрэжыму праводзяцца кварцаванне, прыборка, праветрыванне згодна з графікамі. Ёсць аптэчка неадкладнай дапамогі пры магчымым развіцці непрадбачаных станаў. Вакцынацыя праводзіцца пры наяўнасці ўрача, бо толькі ён мае права прызначыць той ці іншы прэпарат пры развіцці, скажам, алергічнай рэакцыі, — тлумачыць Марына Данчанка. — Некаторыя бацькі хочуць прышчапіцца менавіта ў школе, каб не ісці ў паліклініку і не стаяць у чарзе, не кантактаваць з патэнцыяльна хворымі дзецьмі. Бо ў школе такі ж агляд урача і няма чаргі.



Пры наяўнасці падпісанай інфармаванай згоды бацькоў перад прышчэпкай падлетка аглядае ўрач.

— Гэта вымярэнне тэмпературы, ціску, агляд слізістых насаглоткі, аўскультацыя лёгкіх — усё фіксуецца ў картках, — тлумачыць **урач-педыятр, загадчыца педыятрычнага аддзялення па медыцынскім абслугоўванні дзяцей ва ўстановах адукацыі Марына ДАНЧАНКА.**

Калі падлетак здаровы, урач дае допуск. Пасля прышчэпкі праводзіцца медыцынскае назіранне на працягу 30 хвілін. Пасля дзвюх прышчэпак можна заказаць сертыфікат, ён выдаецца на платнай аснове. Нават калі прышчапіліся ў школе, сертыфікат атрымаць можна толькі ў паліклініцы.

— Паліклініка, якая выканала вакцынацыю, выдае сертыфікат. Трэба звярнуцца з запытам, сертыфікат падрыхтуюць і выдадуць, — кажа Марына Данчанка.

Даныя пра вакцынацыю ўносяцца ў медыцынскую картку. Калі падлетак абслугоўваецца ў іншай паліклініцы, гэтая інфармацыя пасля кожнай прышчэпкі перадаецца туды.

На наступны дзень пасля прышчэпкі школьная медсястра апытвае дзяцей наконт узнікнення пабочных рэакцый. Можа быць нязначны пад'ём тэмпературы, агульная слабасць, боль у месцы ін'екцыі. Аднак на практыцы ў падлеткаў такое сустракаецца рэдка.

Медыкі кажуць, што правяраць узровень антыцелаў перад прышчэпкай немэтазгодна. Імунітэт — комплексная сістэма, і толькі на антыцелы арыентавацца не варта. Пры жаданні, вядома, можна зрабіць гэты аналіз. Калі паміж прышчэпкамі падлетак захварэў, праз месяц пасля выздараўлення курс вакцынацыі пажадана завяршыць.

### ЛЕПШ НЕ ЧАКАЦЬ ДА АПОШНЯГА

Выпускнікам не трэба чакаць мая-чэрвеня, каб атрымаць даведку для паступлення. Адміністрацыя паліклінікі заклікае звяртацца па іх якраз цяпер, калі на прыёме не так шмат наведвальнікаў і ўсе вузкія спецыялісты вярнуліся да аказання планавай дапамогі ў поўным аб'ёме. Спачатку варта запісацца на прыём да ўчастковага педыятра ці падлеткавага ўрача. Яны вызначаць аб'ём неабходных абследаванняў і спецыялістаў, якіх выпускніку трэба наведаць.

— Даведка дзейнічае год, яе можна браць у любым месяцы, і потым летам свабодна рыхтавацца да экзаменаў, не хадзіць у паліклініку і не марнаваць час. Мы інфармуем выпускнікоў праз дырэктараў школ і медыцынскіх работнікаў, маецца адпаведная інфармацыя і на сайце паліклінікі, — кажа Марына Данчанка.

Але каб афарміць даведку, трэба ведаць спецыяльнасць, на якую падлетак будзе паступаць. Калі ён яшчэ не вызначыўся, то прайсці прафагляд можа цяпер, а пасля напісаць у даведцы абраныя спецыяльнасці. Нават калі даведка афармленая, але падлетак вырашыў, што пойдзе на іншую спецыяльнасць, яе могуць дапісаць пасля і заверыць пячаткамі.

Калі раней такія медагляды выпускнікі праходзілі цэлымі класамі, то з пагаршэннем эпідэмічнай сітуацыі яны былі адменены. Цяпер кожны выпускнік мусіць звяртацца па даведку індывідуальна, і трэба ўлічваць, што гэта зойме пэўны час: неабходна прайсці пяць урачоў-спецыялістаў, здаць аналізы і зрабіць кардыяграму. Калі ёсць хранічныя захворванні, могуць спатрэбіцца спецыяльныя абследаванні ці вузкія спецыялісты. Калі выпускнік выбірае ваенныя кірункі, то там больш шырокі агляд.

— Хачу звярнуць увагу на падаўжэнне даведак аб стане здароўя, якія выдаюцца ў месяц нараджэння, — кажа Марына Данчанка. — Такія даведкі, згодна з нарматыўнымі дакументамі, могуць быць падоўжаны толькі адзін раз. Калі яна выдадзена ў канцы 2020 года, а ў 2021 годзе была падоўжана на шэсць месяцаў, то цяпер трэба прыйсці ў паліклініку і ўзяць новую. На аснове такіх даведак фарміруюцца групы на ўроках фізкультуры, у некаторых дзяцей ёсць выключэнні прадуктаў харчавання, і яны маглі змяніцца. Магчыма, у тых, хто перахварэў на каранавірусную інфекцыю, з'явіліся нейкія новыя сімптомы. Пасля COVID-19 пажадана зрабіць кардыяграму і праверыць работу сэрца, здаць аналізы, якія таксама могуць быць са змяненнямі. Нягледзячы на тое, што яны, хутчэй за ўсё, непрацяглыя, але ў дадзены перыяд дзіцяці трэба знізіць фізічную нагрузку. Мог пагоршыцца і зрок, і дзіця трэба перасадзіць бліжэй да дошкі. Цяпер у паліклініках няма вялікай колькасці хворых дзяцей, не ўсім трэба праходзіць шмат спецыялістаў, і такая даведка робіцца хутка.

Не ўсіх спецыялістаў трэба праходзіць і дзецям, якія толькі збіраюцца пайсці ў школу ці дзіцячы садок, іх пералік таксама вызначае ўчастковы педыятр. Не трэба чакаць піка медаглядаў, якія паліклінікі праходзяць з мая да пачатку верасня, звярнуцца можна і цяпер.

**Алена КРАВЕЦ.**

---

Дзеля памяці

## РАЗВІТАННЕ З ГЕРОЕМ

### Пайшоў з жыцця апошні Герой Савецкага Саюза, які жыў у нашай краіне

**У апошні дзень студзеня Іван Кустаў адзначыў свой 98-ы дзень нараджэння, прымаў віншаванні, а тут такая сумная навіна...**



Іван Ільіч апошнім у Беларусі насіў гэтае высокае званне. А нарадзіўся будучы герой у звычайнай сялянскай сям'і на Свярдлоўшчыне. Дзяцінства, як і ў многіх людзей таго пакалення, было нялёгкае: трэба было працаваць не складаючы рук. Іван Кустаў паспяваў яшчэ і вучыцца: пасля заканчэння сельскай школы застаўся працаваць у родным калгасе.

Вялікую Айчынную вайну прайшоў пехацінцам. Вызваляў Украіну, Малдавію, Польшчу. Некалькі разоў быў паранены. Высокае званне Героя Савецкага Саюза Івану Ільічу было прысвоена за кіраванне боем у час кровапралітнага фарсіравання заходняга прытока Віслы — аднаго з самых цяжкіх баёў Вісла-Одэрскай аперацыі, падчас якога рота пад яго камандаваннем адбіла сем атак праціўніка. «За два дні баёў рота пад камандаваннем капітана Івана Кустава было знішчана 210 і захоплена ў палон 25 гітлераўцаў», — сведчаць дакументы ваенных часоў. Івану Куставу тады быў усяго 21 год.

І ў мірны час Іван Ільіч заставаўся воінам-абаронцам: служыў Айчыне, вучыў маладых салдат, працаваў з моладдзю. Нават будучы на пенсіі палкоўнік у адстаўцы не знаходзіўся ўбаку ад таго, што адбывалася ў краіне.

Прэзідэнт Беларусі выказаў спачуванні родным Івана Кустава. «Сышоў з жыцця чалавек нязломнай волі і бязмежнай асабістай мужнасці, усё жыццё якога было найярчэйшым прыкладам служэння Радзіме, народу, вернасці высокім ідэалам і грамадзянскім каштоўнасцям, — гаворыцца ў паведамленні. — Мы страцілі найгоднейшага прадстаўніка легендарнага пакалення герояў-вызваліцеляў, сапраўднага сына сваёй Радзімы. Іван Ільіч сышоў у вечнасць, пакінуўшы яркі след не толькі ў сэрцах сваіх родных і блізкіх, але і ў гісторыі нашай краіны. Яго жыццёвы шлях — гэта сапраўдны прыклад і магутная духоўная апора для цяперашніх і наступных пакаленняў абаронцаў Айчыны. Светлая і добрая памяць аб сапраўдным чалавеку заўсёды будзе жыць у нашых сэрцах».

**Вераніка КАНЮТА.**

# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

4 сакавіка 2022 г. № 8 (644)

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

УСЁ Ў ПАРАДКУ







# РАМОНТЫ ПАД'ЕЗДАЎ, ВІДЭАНАЗІРАННЕ, ДВАРЫ...

## Як працуюць актывісты камітэтаў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання ў новых умовах заканадаўства

**Жыхары ЖЭСа № 11 у Гродне вельмі добра ведаюць старшыню свайго мясцовага камітэта Наталлю САСІМ. І нядзіўна. Яна займае гэту клопатную пасаду амаль 13 гадоў — з таго самага часу, як названыя камітэты пачалі стварацца. І з той пары робіць усё магчымае для камфортнага пражывання жыхароў. Пры неабходнасці турбуе адпаведныя службы. Таких баявых памочніц гарадскія ўлады не пакідаюць без увагі.**

Вось і нядаўна Наталля стала лаўрэатам конкурсу, які праводзіць абласная асацыяцыя мясцовых Саветаў дэпутатаў. Чым не нагода павіншаваць актывістку, а заадно распытаць аб тым, што змянілася ў яе рабоце пасля прыняцця новага Жыллёвага кодэкса, дзе многія работы па ўтрыманні жыллёвага фонду леглі на плечы саміх жыхароў.

Вядома, у першую чаргу Наталлі хочацца расказаць аб прыемным. Напрыклад, аб тым, як сёлета ўпершыню ўстанавілі навагоднія ёлкі ў дварах, упрыгожылі гірляндамі пад'езды. Неадночы збіралі ветэранаў працы на вечарыны. Зараз ідзе падрыхтоўка да свята жанчын — у гэты дзень абавязкова зладзіць салодкі стол для памочніц, якія сочаць за парадкам у сваіх дамах.

А там і вясновыя клопаты. Пачнецца прыборка тэрыторый, пабелка дрэў, афарбоўка дзіцячых пляцовак, азеляненне двароў. Работа, па словах Наталлі, вядзецца ва ўзаемадзеянні з мясцовымі ўладамі. Напрыклад, летась горад дапамог зрабіць паркоўку, удзельнічалі многія жыхары. Таксама ў мінулым годзе сумесна з прадпрыемствам «Белтэлекам» зрабілі дзіцячую пляцоўку ў форме ракеты.

Пастунова ў размове закранаем тэму новых умоў работы ў сувязі з прыняццем Жыллёвага кодэкса. Напрыклад, як вядуцца рамонты ў пад'ездах? Згодна з новым заканадаўствам, цяпер такія работы аплачваюць самі жыхары. Мая суразмоўніца расказала, што ў гэтым кірунку яны пайшлі па шляху кампрамісу.

— Адразу ўвесь дом ахапіць людзі не гатовы. Але і заходзіць у такія неахайныя пад'езды, дзе рамонту не было гадоў сорак, таксама непрыемна. Таму прапанавала пачаць з першых двух паверхаў. А потым паступова рухацца вышэй, можа, у наступным годзе. Мяне падтрымалі, — адзначыла суразмоўніца.

Дарэчы, ініцыятарам такіх рамонтаў якраз і выступае камітэт тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання. Яго члены робяць апытанне жыхароў найбольш праблемных дамоў, праводзяць сход і галасаванне. Калі ёсць неабходная колькасць галасоў — а гэта дзве трэці ўладальнікаў кватэр, — справа скранаецца з месца. Астатнія ўдзельнікі сумеснага домаўладання павінны падпарадкавацца і аўтаматычна ўключаюцца ў спісы.

Як правіла, рамонт робіць альбо нейкая арганізацыя, альбо самі камунальнікі. Там таксама ёсць будаўніча-рамонтныя брыгады. Яны выконваюць работы і выстаўляюць кошт у жыроўкі.

Наталля прыводзіць прыклад нядаўняга рамонту шматпавярховіка. Уваходную групу зрабілі за кошт бюджэту, а вось пад'езд — справа саміх жыхароў. Падлічылі, што з кожнай кватэры выдаткі складуць 21 рубель. Гэта разавая выплата, але і яна можа быць размеркавана на тры месяцы. Потым рамонт плануецца працягваць, пакуль не завершацца работы на ўсіх дзевяці паверхах.

— У наступным годзе будзем зноў два паверхі рамантаваць. Магчыма, зробім хутчэй, бо ў летні перыяд, як вядома, у жыроўках не будзе графы за ацяпленне. Гэту суму якраз і можна замяніць рамонтам пад'ездаў. Магчыма, зробім за год не два, а чатыры паверхі, — разважае мая суразмоўніца і дадае, што кошт рамонту не ўсюды аднолькавы. Хтосьці выбірае даражэйшы варыянт, дзесьці сыходзяцца на менш затратным.

Наталля ўпэўнена: стары жылфонд павінен аднаўляцца. Меркавіта на гэта яна скіроўвае і жыхароў. Сустракаецца з імі, разважае, прыводзіць аргументы аб неабходнасці такіх работ, разам з людзьмі шукае кампрамісныя варыянты.

— Многія прывыклі лічыць, што ўсё робіцца за кошт тэхнічнага абслугоўвання, а яго ўжо недастаткова. У людзей свае жаданні, а магчымасці ў камунальнікаў значна ніжэйшыя.

стар. 17

МІЖПАРЛАМЕНЦКІ ВЕКТАР

# Дзеля забеспячэння роўных правоў і рэалізацыі саюзных праграм

**У Маскве адбылося пасяджэнне камісіі Парламенцкага сходу па сацыяльнай і маладзёжнай палітыцы, навуцы, культуры і гуманітарных пытаннях.**

У ёй прыняў удзел старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці, член названай камісіі Парламенцкага сходу Віктар ЛІСКОВІЧ.

На парадку дня былі пытанні, якія датычыліся выканання бюджэту Саюзнай дзяржавы за 2021 год у частцы вядзення профільнай камісіі, плана работы на 2021—2023 гады, правядзення XV Фестывалю «Моладзь — за Саюзную дзяржаву» ў 2022 годзе і іншыя.

У рамках рабочай паездкі члены камісіі Парламенцкага сходу наведалі адно са знакавых месцаў — Уваскрасенскі Нова-Іерусалімскі манастыр — стаўрапігіяльны мужчынскі манастыр Рускай праваслаўнай царквы, які размешчаны ў Істры Маскоўскай вобласці.

Дарэчы, манастыр быў заснаваны ў 1656 годзе і вядомы як руская Палесціна. Сёння ён зазнае другое нараджэнне — практычна завершана яго рэстаўрацыя, якая доўжылася больш чым 10 гадоў. Мясціна, якая з'яўляецца помнікам расійскай і сусветнай культуры, адноўлена ва ўсёй сваёй прыгажосці.

* * *

**Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Сяргей СІВЕЦ прыняў удзел у пасяджэнні камісіі Парламенцкага сходу па заканадаўстве і рэгламенце.**



У яе рабоце ўдзельнічалі саюзныя парламентарыі, прадстаўнікі Міністэрства фінансаў Рэспублікі Беларусь, Цэнтральнага банка Расіі, Беларускага бюро па транспартным страхаванні, Расійскага саюза аўтастраxаўшчыкоў, а таксама эксперты ў галіне заканадаўства і права.

Парламентарыі разгледзелі пытанні, звязаныя з карэкціроўкай Палажэння аб камісіях Парламенцкага сходу і рэгламенту, у выніку чаго з'явіліся дадатковыя чатыры камісіі, якія будуць уцягнуты ў працэс рэалізацыі 28 саюзных праграм, патлумачылі ў профільнай камісіі Савета Рэспублікі.

— Асобны кірунак — пытанні, звязаныя з заканатворчасцю. У мінулым годзе было прынята рашэнне змяніць рэгламент, напоўніць дзейнасць пастаянных камісій дадатковымі кірункамі, напрыклад, падрыхтоўкай праектаў мадэльных заканадаўчых актаў, якія таксама будуць адным са складнікаў прававой базы Саюзнай дзяржавы, — патлумачыў Сяргей Сівец.

Удзельнікі пасяджэння абмеркавалі парадак сумеснай дзейнасці па падрыхтоўцы мадэльнага заканадаўчага акта «Аб абавязковым страхаванні грамадзянскай адказнасці ўладальнікаў транспартных сродкаў» і меры па зніжэнні ў Беларусі мінімальнага тэрміну абавязковага страхавання грамадзянскай адказнасці ўладальнікаў транспартных сродкаў, зарэгістраваных за мяжой, да пяці дзён.

Дарэчы, рашэнне гэтых пытанняў накіравана на ўдасканаленне і ўніфікацыю парадку страхавання аўтаграмадзянскай адказнасці ў Беларусі і Расіі для забеспячэння роўных правоў грамадзян і адзіных выгадных умоў пры ажыццяўленні паездак па тэрыторыі Саюзнай дзяржавы.

МЕРКАВАННЕ

Дзмітрый БАСКАЎ:

## «З-за рашэнняў замежных спартыўных федэрацый пацярпелі нашы трэнеры і спартсмены»

**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці — аб неправамерных дзеяннях міжнародных спартыўных функцыянераў.**

— Рашэнні замежных спартыўных федэрацый аб адхіленні нацыянальнай, зборных і клубных камандаў Беларусі ад удзелу ў турнірах з-за сітуацыі на Украіне несправядлівыя і прадузятыя, — лічыць сенатар.

Ён з сумам канстатуе, што з-за гэтых рашэнняў пацярпелі трэнеры і спартсмены — 16—17-гадовыя хлопцы з юніёрскай зборнай па хакеі, якія былі адхіленыя ад удзелу ў красавіцкім чэмпіянаце свету толькі таму, што яны нарадзіліся ў Беларусі.

— І, напэўна, не толькі ў мяне ўзнікае пытанне — чаму падобныя санкцыі ні разу не былі ўжытыя да ЗША, якія ўвязваліся ў ваенныя канфлікты на працягу некалькіх дзесяцігоддзяў, — звяртае ўвагу Дзмітрый Баскаў. — У дачыненні да іх зборных ні па адным відзе спорту не былі ўжытыя адпаведныя санкцыі спартыўных арганізацый.

Парламентарый працягвае разважанні і прыходзіць да высновы, што і тут мае месца палітыка двайных стандартаў.

— Гэтыя санкцыі, якія не маюць нічога агульнага са спортам, былі прынятыя пад ціскам еўрапейскіх нацыянальных федэрацый, супраць камандаў якіх і павінны былі выступаць нашы хлопцы, — падкрэслівае Дзмітрый Баскаў. — Федэрацыі, чые краіны сабраліся напампоўваць Украіну зброяй, у той час як менавіта Беларусь стала адзінай краінай, якая ў сітуацыі, што склалася, прыкладае рэальныя намаганні да забеспячэння міратворчага працэсу і выступае пляцоўкай для вядзення мірных перагавораў паміж Расіяй і Украінай.

БЛІЗКАЯ ЎЛАДА

# АТРЫМАЦЬ ВЫЧАРПАЛЬНЫЯ АДКАЗЫ

**Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Таццяна РУНЕЦ правяла ў Савеце Рэспублікі асабісты прыём грамадзян, у тым ліку індывідуальных прадпрымальнікаў, іх прадстаўнікоў і прадстаўнікоў юрыдычных асоб.**



Звычайна для заяўнікаў не бывае дробязных пытанняў, што і зразумела: сітуацыя ім уяўляецца надта складанай, таму і звяртаюцца да ўлады. Справа апошняй — разабрацца і дапамагчы. Спрыяе гэтаму, вядома, зварот па адрасе, то-бок на профілі таго, хто вядзе такі прыём.

У першы дзень вясны на прыём да старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах, дарэчы, і прыйшлі заяўнікі з «грашовымі» пытаннямі.

Як паведамілі ў профільнай камісіі, заяўнікі звярнуліся да сенатара па аказанне садзейнічання ў пацвярджэнні групы інваліднасці, вырашэнні праблем, звязаных з атрыманнем пенсіі вайскоўца, атрыманні льгот матулям, якія выхоўваюць дзяцей-інвалідаў, старэйшых за 18 гадоў, і іншыя.

Па ўсіх агучаных пытаннях дадзены вычарпальныя адказы, а тыя, якія патрабуюць дадатковага вывучэння, узяты на кантроль.

* * *

**На мінулым тыдні з грамадзянамі ў Савеце Рэспублікі сустракаўся старшыня Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей РАЧКОЎ.**

Да сенатара заяўнікі звярнуліся па пытанні атрымання ацэнкі праваахоўнымі органамі несвоечасовага будаўніцтва аб'екта, размешчанага ў сталіцы.



— Сітуацыя няпростая. Мы накіруем прадстаўленне ў зацікаўленыя органы для разгляду ў рамках дзеючага заканадаўства і возьмем пытанне на кантроль, — патлумачыў парламентарый.

Дарэчы, днямі на адрас парламентарыя прыйшла падзяка ад жыхаркі Слоніма па садзейнічанні ў забеспячэнні бяспекі дарожнага руху па вуліцы Чырвонаармейскай у райцэнтры.

Па просьбе парламентарыя на вуліцы была ўстаноўлена адмысловая штучная няроўнасць, УДАІ УУС Гродзенскага аблвыканкама забяспечыла арганізацыю перыядычнага кантролю за выкананнем удзельнікамі дарожнага руху патрабаванняў Правілаў дарожнага руху, у тым ліку з выкарыстаннем мабільнага датчыка кантролю хуткасці, які функцыянуе ў аўтаматычным рэжыме.

З пачатку года на гэтай вуліцы было выяўлена 135 парушэнняў ПДР, у тым ліку чатыры факты перавышэння хуткасці руху.

Як патлумачылі ў профільнай камісіі, кантроль за выкананнем удзельнікамі дарожнага руху патрабаванняў ПДР будзе працягнуты, у тым ліку з выкарыстаннем сродкаў адзінай сістэмы фотафіксацыі парушэнняў хуткаснага рэжыму.

* * *

**Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, культуры, навуцы і сацыяльным развіцці, старшыня Гомельскай абласной арганізацыі Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа Ала СМАЛЯК правяла прамую лінію.**

Жыхарка райцэнтра Хойнікі распавяла сенатару аб праблеме няякаснай пітной вады. Неадназова для вырашэння гэтай праблемы да заяўніка прыязджала служба ЖКГ, аднак сітуацыя не змянілася. Парламентарый узяла зварот на асабісты кантроль.



Жыхары Гомельскага рэгіёна таксама цікавіліся сёлетнімі ўступнымі выпрабаваннямі ва ўстановы адукацыі, кадравай сітуацыяй у сацыяльнай сферы і іншымі пытаннямі. Па кожным звароце былі дадзены вычарпальныя тлумачэнні.

* * *

**Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы, генеральны дырэктар дзяржаўнага вытворчага аб'яднання па паліве і газіфікацыі «Белпалівагаз» Аляксей КУШНАРЭНКА правёў асабісты прыём грамадзян, іх прадстаўнікоў і прадстаўнікоў юрыдычных асоб у грамадскай прыёмнай сталіцы.**

Заяўнікі ўзнялі шэраг пытанняў: газіфікацыя, тэхнічнае абслугоўванне газавага абсталявання, разлікі за спажыты газ і працоўныя ўзаемаадносіны. Некаторыя пытанні былі вырашаны падчас прыёму.

ВЕДАЙ НАШЫХ!

## Сенатар — жанчына года сталіцы

Таццяна РУНЕЦ перамагла ў намінацыі «Актыўная грамадзянская пазіцыя».

**Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах узяла ўдзел у цырымоніі ўзнагароджання пераможцаў гарадскога этапу рэспубліканскага конкурсу «Жанчына года — 2021».**



— Нечакана і прыемна стаць пераможцай у такой намінацыі. Асабліва ў Мінску, дзе традыцыйна высокая канцэнтрацыя жанчын — яркіх асоб з амбіцыямі, вялікім патэнцыялам, зараджаных на прадукцыйную дзейнасць на карысць нашай Беларусі, — адзначыла старшыня профільнай камісіі. — Упэўненая, што актыўную грамадзянскую пазіцыю павінен мець кожны з нас, адстойваючы і рэалізоўваючы на практыцы базавыя прынцыпы дзяржаўнай палітыкі.

Адзначым, што арганізатарам гарадскога этапу рэспубліканскага конкурсу выступіла Мінская гарадская арганізацыя ГА «Беларускі саюз жанчын».

«МС» далучаецца да віншаванняў з гэтай нагоды і жадае Таццяне Аркадзеўне новых яркіх перамог і дасягнення яшчэ большых вышынь у прафесійным і грамадскім жыцці!

НА ПАРАДКУ ДНЯ

## Айчынны вытворца — дзеля барацьбы з COVID-19

**Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Віктар ЛІСКОВІЧ правёў рабочую нараду па звароце старшыні Прэзідыума НАН Беларусі Уладзіміра Гусакова, які той накіраваў у верхнюю палату парламента.**

Тэма звароту датычылася падтрымкі вытворчасці дзяржаўным прадпрыемствам «Акадэмфарм» лекавых прэпаратаў для лячэння пацыентаў з COVID-19.

Як паведамілі ў прэс-службе Савета Рэспублікі, у шырокім коле ўдзельнікаў нарады дэталёва абмеркаваны выпрацаваныя прапановы і выпрацаваны канструктыўныя шляхі вырашэння пытанняў падтрымкі вытворчасці ў мэтах забеспячэння медыцынскай бяспекі насельніцтва і памяншэння выдаткаў на лячэнне пацыентаў з COVID-19 дарагімі імпартнымі прэпаратамі.

— Наша фармацэўтычная прамысловасць распрацоўвае лекавыя прэпараты для лячэння COVID-19 з мэтай павышэння іх даступнасці. Павінна быць забяспечана аператыўнае ўзаемадзеянне ўсіх зацікаўленых арганізацый. Пры гэтым самым універсальным і найлепшым спосабам засцярогі ад каранавіруснай інфекцыі ўсё роўна з'яўляюцца вакцынацыя і своечасовая рэвакцынацыя, — падкрэсліў старшыня профільнай камісіі.

У мерапрыемстве ўдзельнічалі прадстаўнікі Міністэрства аховы здароўя, НАН Беларусі, ДП «Акадэмфарм» і іншыя зацікаўленыя.

## Узаемадзеянне на карысць чалавека

**Сенатар абмеркавала арганізацыю дапамогі бежанцам з прадстаўнікамі міжнародных арганізацый.**

**Член Савета Рэспублікі, старшыня Гомельскай абласной арганізацыі Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа Ала СМАЛЯК** сустрэлася з прадстаўнікамі Упраўлення Вярхоўнага камісара Арганізацыі Аб'яднаных Нацый па справах бежанцаў і Міжнароднай арганізацыі па міграцыі ў Рэспубліцы Беларусь.

Асноўнай тэмай сустрэчы стала магчымае супрацоўніцтва па пытанні аказання дапамогі перасяленцам з Украіны.

На сустрэчы парламентарый звярнула ўвагу, што рэгіянальная арганізацыя БТЧК гатовая аказаць такую дапамогу, калі ў гэ-



тым будзе неабходнасць і паступяць адпаведныя запыты ў арганізацыю. Яна падзякавала міжнародным партнёрам за гатоўнасць да ўзаемадзеяння на карысць чалавека.

Бакі таксама адзначылі, што гатовыя прыкласці ўсе намаганні, каб неабходная дапамога аказвалася своечасова і ў поўным аб'ёме. Арганізацыі дамовіліся падтрымліваць кантакты і аператыўна інфармаваць адзін аднаго аб сітуацыі.

## У інтарэсах абедзвюх краін

**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы, член камісіі Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі па бяспецы, абароне і барацьбе са злачыннасцю Валерый ГАЙДУКЕВІЧ узяў удзел у пасяджэнні камісіі ПС у фармаце відэаканферэнцыі.**

Парламентарыям была прадстаўлена інфармацыя аб распрацоўцы праектаў канцэпцый праграм Саюзнай дзяржавы ў сферы бяспекі, абароны і барацьбе са злачыннасцю.

Пацверджана запатрабаванасць падрыхтоўкі новых праектаў праграм, дзяржаўным заказчыкам рэкамендавана працягнуць распрацоўку праектаў канцэпцый новых праграм, правесці пагаджальныя працэдуры і ва ўстаноўленым парадку ўнесці іх на разгляд у Савет Міністраў Саюзнай дзяржавы.

Таксама ўдзельнікі пасяджэння абмеркавалі ход распрацоўкі канцэпцыі інфармацыйнай бяспекі Саюзнай дзяржавы.

На думку дэпутатаў, сумесная дзейнасць профільных міністэрстваў і ведамстваў Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі па забеспячэнні інфармацыйнай бяспекі Саюзнай дзяржавы з'яўляецца важным напрамкам абароны нацыянальных інтарэсаў абедзвюх краін.

Акрамя таго, парламентарыям прадстаўлена інфармацыя аб выніках выканання бюджэту Саюзнай дзяржавы ў 2021 годзе ў частцы рэалізацыі праграм і мерапрыемстваў па профілі дзейнасці камісіі Парламенцкага сходу. Са свайго боку, парламентарыі адзначылі асаблівую значнасць рэалізацыі мерапрыемстваў гэтых праграм для гарантавання бяспекі Саюзнай дзяржавы.

Кіно па-за часам

# ЧАС УСЁ ВЫЗНАЧЫЦЬ

**Згадваць дні нараджэння кінамайстроў — добрая традыцыя на «Беларусь 3». Так, 8 сакавіка ўспомнім пра акцёра тэатра і кіно, кінарэжысёра, сцэнарыста і народнага артыста СССР Яўгена Мацвеева ў дзень яго 100-гадовага юбілею. Аўдыторыю чакаюць паказ мастацкага фільма «Дом, у якім я жыву» з удзелам акцёра і выпуск перадачы «Апошні дзень», прысвечаны творцу.**

Розныя ролі і характары давялося за гады ў прафесіі прымераць на сябе Яўгену Сямёнавічу. А ў карціне «Дом, у якім я жыву» ён сыграў ролю сына галоўных герояў, Канстанціна. Яго персанаж — чалавек, на лёс якога можна глядзець па-рознаму, але заўсёды гэта будзе нагодай падумаць і пра нешта сваё, асабістае. ...Дзеянне кінастужкі пераносіць нас у 1935 год, калі ў новы дом на ўскраіне Масквы ў «камуналку» ўязджаюць дзве сям'і. Падзеі разгортваюцца вакол Давыдавых. У іх трое дзяцей, якія назіраюць, як па меры сталення змяняюцца яны самі і іх жыццё — кожны шукае сябе і сваё месца пад сонцам, а разам з тым і адказы на пытанні, кім і якімі быць. А потым нечакана пачынаецца вайна — і многае, ведама, ужо мяняецца назаўсёды. Іншымі становяцца людзі, іх погляды на жыццё і каштоўнасці. Як пасля гэтага пачаць усё спачатку і ці кожнаму з герояў тое ўдасца?

**Алена ДРАПКО.**



## ШАШКІ
(«Звязда»)
Выпуск № 160

19 лютага ў Гомелі на базе ДУ "СДЮШАР № 3 па шахматах" прайшоў «Сямейны турнір» па шашках-64, у камандзе ўдзельнічаў адзін юны шашыст плюс адзін дарослы член сям'і. 17 камандаў узялі ўдзел у турніры. Ва ўпартай барацьбе першае месца заняла каманда Інгі Барашкі (Інга + тата Вячаслаў), на другім месцы — каманда Антона Шымакова (Антон + тата Дзмітрый), на трэцім — каманда Філіпа Гудзіновіча (Філіп + дзядуля Сяргей).

**№ 25**



Першыя тры кампазіцыі даслаў Валерый Кручкоў (г. Кагарлык, Кіеўская вобласць, Украіна).

**№ 25**

**Белыя простыя:** g3, f4, e5, g7 (4).

**Чорныя простыя:** d2, e3, b4, h4, c7 (5).

**№ 26**

**Белыя простыя:** g1, h2, e3, d6, e7 (5).

**Чорныя простыя:** a3, b4, h4, c5, g5 (5).

**№ 27**

**Белыя простыя:** 46, 48, 42, 44, 37, 40, 31, 24, 20 (9).

**Чорныя простыя:** 36, 33, 26, 21, 22, 18, 12, 15, 9, 10 (10).

Наступныя мініяцюры складзеныя вядучым аддзела.

**№ 28**

**Белыя простыя:** f2, b6, d6, c7, e7 (5).

**Чорныя простыя:** c3, h4, a5, g7, f8 (5).

**№ 29**

**Белыя простыя:** d4, f4, g5, b6, f6 (5).

**Чорныя простыя:** b2, d2, f2, c5, a7 (5).

**№ 30**

**Белыя простыя:** e1, g1, f2, a3, e3 (5).

**Чорныя простыя:** g3, f4, h4, g5, a7 (5).

**№ 31**

**Белыя простыя:** g1, f2, h4, a7 (4).

**Чорныя простыя:** g3, g5, f6, c7, e7, g7 (6).

Ва ўсіх пазіцыях белыя пачынаюць і выйграюць. Прозвішчы чытачоў, якія дашлюць правільныя адказы, будуць апублікаваныя.

Праверце свае рашэнні:

Выпуск № 159 ад 18.02.22.

№ 18 1. f4-g5 h6:f4 2. g3:e5 f6-g5 3. e5-f6 g7:e5 4. d4:d8 f8-e7 5. d8:f6 g5:e7 6. h2-g3 e7-f6

[ 6...e7-d6 7. g3-f4 d6-c5 8. f2-e3 c5-b4 9. c3-d4 b4-c3 10. d4:b2 a5-b4 11. f4-g5 h4:f6 12. e3-f4 ]

7. g3-f4 +

№ 19 1. c3-d4 a5:a1 2. g3-f4 a1:g3 3. h2:b8 d8-c7 4. b8:g7 h8:f6 5. e3-f4 +

№ 20 1. g3-h4 d6:f4 2. h4:b6 a5:c7 3. e3:g5 h6:f4 4. d2-e3 x.

№ 21 1. g1-f2 d6:f4 2. f2:b6 a5:c7 3. e3:g5 h6:f4 4. d2-e3 f4:d2 5. e1:c3 +

№ 22 1. 24-20 35:33 2. 19-14 09:40 3. 14:05 15:24 4. 05:28 22:33 5. 49-43 04-10 6. 43-39 33:44 7. 50:39 +

№ 23 1. 37-32 28:39 2. 17:28 33:42 3. 19-14 24:22 4. 35:04 09:20 5. 04:17 +

№ 24 1. 40-34 39:30 2. 49:40 35:44 3. 19:49 28:19 4. 12:03 01:12 5. 17:08 16:33 6. 26-31 37:17 7. 03:37 27-32 8. 37:28 38-42 9. 28-37 42:31 10. 49-32 +

З лістоў чытачоў: «Дзякуем аўтарам і вядучаму за падрыхтоўку цікавага гульнявога матэрыялу», — пішуць Ф. Карпей і Л. Жыхар.

Першымі дакладныя адказы даслалі: Л. Трафімчык (Іўе), С. Рашэцін (Ашмяны), С. Бурко (Орша), В. Таўкачоў (в. Уздзевічы, Клімавіцкі р-н, Магілёўская вобл.), У. В. Дударэвіч (Брэсцкая вобл., Баранавіцкі р-н, в. Новая Мыш), А. Галаванаў, П. і В. Шульгі (усе — Мінск), Ф. Карпей, Л. Жыхар (абодва — Мядзел), У. Панько (Каменец), І. Ананіч (Гродна), В. Ваўчкоў (Маладзечна).

Пішыце па адрасе: газета «Звязда», г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013,

e-mail: info@zviazda.by або vorush@yandex.ru.

**Віталь ВАРУШЫЛА,**
**майстар спорту.**



Сядзі і глядзі

# Жанчыны бываюць розныя...

**У аўторак каляндар пакажа дату 8 Сакавіка. Як вядома, ужо стала традыцыяй святкаваць яе як Міжнародны дзень жанчын. І ў эфіры беларускіх тэлеканалаў свята адзначаць паказам кінафільмаў і трансляцыяй музычных праграм.**

На сацыякультурным нас чакаюць паказы кінастужак «Беражыце жанчын», «Варвара-краса, доўгая каса» і «Доўгая дарога ў дзюнах». Апошняя, дарэчы, па папулярнасці ў гледачоў у свой час магла спаборнічаць з такімі кінахітамі, як «Сямнаццаць імгненняў вясны», «Вечны кліч» ці «Цені знікаюць апоўдні». І лічыцца, што сваім поспехам фільм (зняты Алаізам Брэнчам) абавязаны ў тым ліку і цудоўнай музыцы, якую напісаў для яго Раймаид Паўлс. Дзеянне кінастужкі адбываецца ў Латвіі і ахоплівае перыяд з 1939-га амаль да нашага часу. Падзеі, што адбываліся ў краіне, па-рознаму адбіваюцца на лёсах герояў, але ўсё ж іх вядзе па жыцці любоў у розных праявах. ...Курсант Артур Банга прыязджае на пахаванне свайго бацькі, а пасля дазнаецца, што ў спадчыну атрымаў даўгі сям'і. Таму хлопец прымае рашэнне спыніць вучобу і застацца на радзіме, каб працягваць бацькаву справу і разлічыцца з крэдыторам Якабам Озалсам. Развітаўшыся з марай стаць капітанам і вярнуўшыся да цяжкай працы рыбака, Артур сустракае дачку Якаба Марту, з якой яны сябравалі ў дзяцінстве. Аднак з узростам іх сімпатыі перарастаюць у сапраўднае каханне. А куды прывядзе маладых людзей вялікае пачуццё, толькі час пакажа... Усе сем серый глядзіце ў дзённым эфіры на «Беларусь 3».

А вось музычная камедыя «Беражыце жанчын» стала дэбютам на экране для вядомага спевака і кампазітара Юрыя Антонава. Гісторыю пра маладога студэнта-журналіста, які трапляе на карабель «Цыклон», дзе служаць толькі дзяўчаты, знялі рэжысёры Аляксандр Палынніка ў і Віктар Макараў у 1981 годзе. Маладыя марачкі ў штыкі прымаюць чужынца Жэню, а той бярэ і ідзе ў самадзейны партовы ансамбль, што дазваляе хлопцу паказаць сябе з нечаканага боку... На «Беларусь 3» у гэты дзень не абыдзецца і без музычных віншаванняў. Тут пачуем і ўбачым праграму «Вітаем вас!» ансамбля народнай музыкі «Бяседа» і канцэрт маладых выканаўцаў ды зорак беларускай эстрады «Сонца свеціць усім».

У эфіры тэлеканала АНТ 8 сакавіка таксама будуць падарункі для прыхільнікаў савецкай класікі. Нас чакаюць паказы фільмаў "Вясна на Зарэчнай вуліцы» (рэж. Марлен Хуцыеў, 1956) і «Карнавал» (1981, рэж. Таццяна Ліёзнава). Гэта дзве гісторыі, знятыя ў розны час, але ў кожнай з іх ёсць яркія вобразы жанчын. «Вясна на Зарэчнай вуліцы» знаёміць нас з выпускніцай педінстытута Таццянай Сяргееўнай, якая пасля вучобы пачынае працаваць у класе для рабочай моладзі. І адзін з вучняў пачынае праяўляць да маладой настаўніцы асаблівую ўвагу. Дзяўчына пазбягае кавалера, але той не прывык, каб жанчыны яму адмаўлялі. А пасля Аляксандр разумее, што да яго прыйшло сапраўднае пачуццё, і гэта мяняе сітуацыю. Трэба адзначыць, фільм адкрыў дарогу ў прафесію новаму пакаленню акцёраў. Тут дэбютавалі Юрый Бялоў, Мікалай Рыбнікаў, Генадзь Юхцін. А вось ролю настаўніцы ўвасобіла на экране непрафесійная актрыса Ніна Іванова. Яна вучылася на ўрача, але згадзілася па-сяброўску зняцца ў кінастужцы. Пасля ёй яшчэ паступалі прапановы ад рэжысёраў, але Іванова ўсё ж расчаравалася ў акцёрскай рабоце і перайшла працаваць «за кадрам», дзе спачатку займалася напісаннем сцэнарыяў, а пасля наогул вярнулася ў першую прафесію і стала медсястрой.





А фільм «Карнавал» — гэта аповед пра правінцыялку Ніну Саламаціну, якая прыязджае ў Маскву з марай стаць актрысай. У сталіцы жыве яе бацька, але гераіня спадзяецца толькі на ўласныя сілы. Галоўнае — сустрэць тых людзей, якія здолеюць разгледзець у дзяўчыне яе талент і настойлівасць. Ідэя фільма «Карнавал» прыйшла да рэжысёра «Сямнаццаці імгненняў вясны» Таццяны Ліёзнавай, калі яна натрапіла на аповесць Ганны Радзівонавай пра правінцыяльную дзяўчыну, якая прыехала пакараць сталіцу. Сюжэт адразу зачапіў рэжысёра і, як яна потым адзначыла, «зразумела, што многія пазнаюць сябе ў галоўнай гераіні... Карціна ў пэўнай ступені атрымалася нават аўтабіяграфічнай».

**Алена ДРАПКО.**

**Фота з адкрытых крыніц.**

## Беларусь 1

6.00 Слова Мітрапаліта Веніяміна на свята Урачыстасці Праваслаўя.
**6.10 Драма «За паўгадзіны да вясны» (16+).**
7.55 Клуб рэдактараў (16+).
9.00, 12.00, 15.00, 19.00 Навіны.
9.10 «Арсенал» (12+).
9.40 Гісторыі выратавання (12+).
10.15 Зона Х. Вынікі тыдня (16+).
10.50 Маршрут пабудаваны (12+).
11.30 «Пытанне нумар адзін».
12.10 «Засакрэчаная вайна». Мастацка-публіцыстычны фільм (12+).
**12.25 Драма «Дочкі-маці» (16+).**
13.25 «Я ведаю» (6+).
15.15 Вакол планеты.
15.55 Таямніцы следства (12+).
16.25 Адзін дзень (12+).
**16.55 Драма «Саўдзельнікі» (16+).**
19.10 Урачысты канцэрт-рэквіем, прысвечаны Дню міліцыі.
20.35 Навіны надвор'я.
21.00 Галоўны эфір.
**22.30 Драма «Паслухмяная жонка» (16+).**

## Беларусь 2

6.00 «Уключайся. Лепшае за тыдзень» (12+).
8.00, 19.40 Тэлебарометр.
**8.05 «Клон». Серыял (16+).**
9.00 Анімацыйны серыял «Стыч!» (6+)
**9.45 Фэнтэзі «Дом дзіўных дзяцей Міс Перагрын» (16+).**
11.50 «Тры першыя спатканні» (16+).
**12.40 Трылер «Інферна» (16+).**



14.40 «Тата папаў» (16+).
17.00 «Вежа» (12+).
**17.55 Камедыя «Мамчын сынок» (16+).**
20.10 «На кручку» (16+).
21.10 Спортлато 5 з 36, КЕНА.
21.20 Дзеянне «Зялёны шэршань» (12+).
23.20 «Да спаткання» (16+).

## Беларусь 3

7.30 «Канікулы Баніфацыя». М/ф (0+).
7.50 «Святыні Беларусі».
8.15, 14.25 Навіны культуры.
**8.25 «Шафёр паняволі». Маст. фільм (12+) [СЦ].**
10.00 «Наперад у мінулае».
10.25 «Беларуская кухня».
10.55 «Нацыянальны хіт-парад».
**11.50 «Лёс рэзідэнта». Маст. фільм (12+) [СЦ].**
14.35 «Сваімі словамі».
15.15 «Будзе свята». Канцэрт.
16.25 «Архітэктура Беларусі».
**16.40 «Правы на стрэл». Маст. фільм (12+).**
18.05 «Кадры жыцця».
**18.55 «Вусаты нянь». Маст. фільм (6+).**
20.10 «Кампазітары Беларусі».
20.40 «Калыханка» (0+).
**21.05 «Полымя». Маст. фільм (12+) [СЦ].**

## Беларусь 5

7.00, 23.00 Тэніс. WTA.
9.00 Сняданак чэмпіёна.
9.30 Біятлон. Кубак свету. Мужчыны.
10.25 Біятлон. Кубак свету. Жанчыны.
11.15 Піт-стоп.
11.50 Хакей. Чэмпіянат Беларусі.
14.20, 18.15 Біятлон. Кубак свету.
15.50 Футбол. Суперкубак Беларусі-2022. Жанчыны. ФК «Мінск» — «Дынама-Мінск».
19.20 Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Арсенал» — «Лестэр».
21.20 Баскетбол. Адзіная ліга ВТБ. «Цмокі-Мінск» — «Астана» (Нур-Султан).

## АНТ

7.00, 9.00, 16.00 [СЦ] Нашы навіны.
7.10 «Здароўе» (16+).
8.10 «Жыццё іншых» (12+).
9.10 «Метэагід».
9.30 «Народны кухар» (12+).
10.40 «Бачылі відэа?» (6+)
**12.45 Серыял «Вылячэнне» (12+).**
16.20 Гала-канцэрт «Паміж мінулым і будучым» (12+).
18.10 «Дзве зоркі. Бацькі і дзеці» (12+).
20.00 Контуры.
**21.35 Фільм «Батальён» (12+).**
0.00 «Спортклуб» (16+).
**0.20 Серыял «Курт Сеіт і Аляксандра» (16+).**

## СТБ

6.35, 0.15 «Сакрэты старажытных прыгажунь» (16+).
8.15 «Мінтранс» (16+).
9.10 «Ці ведаеце вы, што?» (16+)
10.00 «Скардзіцца дазваляецца».
10.30, 13.30, 16.30 Навіны «24 гадзіны».
10.40 «Вялікі горад».
11.10, 21.15 Дакументальны спецпраект (16+).
**12.00, 13.40, 16.40 «Павук». Серыял (16+).**
19.30 «Тыдзень».
22.45 «Засакрэчаныя спісы» (16+).
1.55 «Эліксір маладосці» (16+).

## МІР

**5.00 Маст. фільм «Лузер» (16+).**
5.45 Мультфільмы (0+).
**7.30 Маст. фільм «Вій» (12+).**
8.55 Дак. фільм «Востраў Таймыр» (12+).
9.25 «ФазэндаЛайф» (6+).
10.00, 16.00 Навіны (бягучы радок).
**10.10, 16.15 Серыял «Начныя ластаўкі» (16+).**
18.30, 0.00 «Разам».
**19.30, 1.00 Серыял «Люты» (16+).**
**4.40 Серыял «Люты-2» (16+).**

## РТР—Беларусь

**7.05 Фільм «Тэрмін даўнасці» (12+).**
10.25 «Ранішняя пошта з Мікалаем Баскавым».
11.00 Весткі.
**11.30 Фільм «Кахаць і верыць» (12+).**
**15.05 Фільм «Мой тата — ідэаліст» (12+).**
**16.50 Серыял «Я ўсё памятаю» (12+).**
20.00 Весткі тыдня.
21.05 «У людзях».
**21.45 Фільм «Шчаслівая шэрая мыш» (12+).**
23.25 Масква. Крэмль. Пуцін.
0.05 «Нядзельны вечар з Уладзімірам Салаўёвым» (12+).

## НТБ—Беларусь

6.10 «Астрапрагноз».
6.15 «Погляд на Беларусь» (12+).
6.40 Беларусы (6+).
7.10 Сёння. Галоўнае.
7.25 «Навукаманія» (6+).
8.00, 10.00, 16.00 Сёння.
8.20 «Я хачу гэта ўбачыць!» (6+)
8.55 «Проста і смачна» (6+).
9.30 «Урачэбныя таямніцы плюс» (12+).
**11.00, 22.35** «КВЗ. Па-нашаму» (16+).
**12.00** «Галерэя прыгажосці» (16+).
**12.50** «Не здрыганіся!» (16+)
**13.50** Каледж» (16+).
**15.30** «Суперліга» (16+).
**17.00, 0.55** «Форт Баярд» (16+).
**18.30** Серыял «#СеняФедзя» (16+).



**20.00** «Руская не смяюцца» (16+).
**21.00** Камедыя «Чараўнік» (12+).
**0.00** Серыял «Каманда Б» (16+).
**2.15** Серыял «Кадэцтва» (12+).
**3.50** «Адна за ўсіх» (16+).
**5.10** «6 кадраў» (16+).

## Культура

**6.30, 7.00, 7.30, 8.30, 10.00, 15.00, 19.30, 23.40** Навіны культуры.
**6.35** «Пешшу...»
**7.05** Легенды сусветнага кіно.
**7.35** «Свет, які пабудаваў П'ер Кардэн». Дак. фільм.
**8.35, 13.55, 2.40** Колер часу.
**8.45, 15.50** «Капітан Нэма». Маст. фільм.
**10.15** «Назіральнік».
**11.10, 0.00** XX стагоддзе.
**12.05, 22.15** «Бярозка». Серыял [СЦ].
**14.05** Лінія жыцця [СЦ].
**15.05** Навіны. Падрабязна. Кіно.
**15.20** «Біблейскі сюжэт».
**17.05, 1.45** «Галіна Уланава. Незададзеныя пытанні». Дак. фільм.
**18.00** «Грыг. З часоў Хольберга». Фільм.
**18.35, 0.50** «Чалавек — гэта выпадковасць? Што прымусіла мозг расці». Дак.фільм [СЦ].
**19.45** «Галоўная роля».
**20.05** «Правілы жыцця».
**20.30** «Добрай ночы, малыя!».
**20.45** «След, які свеціцца». Дак. фільм [СЦ].
**21.30** Улада факта.
**23.10** «Адлюстраваны час». Серыял [СЦ].

## Настальгія

**6.00** «СевАлогія» (18+).
**7.00, 8.40, 9.40, 11.00, 14.10, 15.40, 17.00, 18.45, 20.20, 21.40, 23.00, 2.40, 3.40, 5.25** Музычная настальгія.
**7.30** Маст. фільм «Рабро Адама» (18+).
**9.00, 15.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час» (12+).
**10.00, 16.00, 22.00, 0.00** «Народжаны ў СССР».
**11.25, 14.25** «Блеф-клуб» (16+).
**12.00** «Спяем, сябры!» (12+)
**13.00** Маст. фільм «Кахаць» (18+).
**18.00** «Быў час» (16+).
**19.00** Маст. фільм «Матылькі» (18+).
**1.05** Фільм-канцэрт «Чырвона-Белае мора капітана Кіма» (12+).
**4.00** Маст. фільм «Дараванне» (18+).

## EuroSport 1

**1.00, 20.45, 23.45** Навіны (16+).
**1.05, 23.50** The Minute (16+).
**1.10, 7.00, 15.30, 16.15, 19.15, 20.50** Веласпорт. «Парыж — Ніца» (16+).
**2.30, 8.00, 15.00, 18.00** Веласпорт. «Тырэна — Адрыятыка» (16+).
**3.30** Скачкі на лыжах з трампліна. КС. Мужчыны (16+).
**5.00, 23.55** Снукер. Turkish Masters (6+).
**9.00, 9.45** Горныя лыжы. КС. Мужчыны (16+).
**14.00** Тэлечасопіс Judo Show (16+).
**19.30, 22.00, 22.30** Горныя лыжы. КМ. Мужчыны.

## Кінакамедыя

**1.25** Скінь маму з цягніка (12+).
**2.55** Лаві момант (16+).
**4.10** Куленепрабівальны (12+).
**5.50** Белаcнежка: помста гномаў (12+).



**7.45** Белыя цыпачкі (12+).
**9.45** Як ведаць... (16+)
**12.00** Гэты шалёны, шалёны, шалёны, шалёны свет (6+).
**15.00** За бортам (12+).
**17.05** Чаго жадаюць жанчыны? (16+)
**19.30** Дзе мая тачка, чувак? (12+)
**21.00** Круты і цыпачкі (12+).



**22.50** Кіраванне гневам (12+).

## ТБ3

**6.00** Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
**9.45** «Гадзіннік кахання» (16+).
**10.40** «Перыскоп» (16+).
**11.00** «Вялікая маленькая хлусня». Серыял (16+).
**12.20, 18.10** «Знакі лёсу» (16+).
**12.55, 17.00** «Старац» (16+).
**14.05, 18.50, 3.10** «Сляпая» (16+).
**15.15, 20.00, 4.05** «Варажбітка» (16+).
**16.25** «Цуд» (12+).
**21.10** «Навігатар» (16+).
**22.15** «Мая» (16+).
**23.20** «Дзённік экстрасэнса» (16+).
**0.20** «Лінія абароны» (16+).
**0.55** «Леон» (16+).
**4.30** «Суд ідзе». Серыял (16+).

## ТБ1000

**5.00, 5.40, 17.15, 18.05** Элементарна (16+).
**6.25** Цуда-жанчына (16+).
**9.00** Анёлы Чарлі (12+).
**10.45** Анёлы Чарлі: толькі наперад (12+).
**12.45** Мексіканец (16+).
**15.00** Мачаха (12+).
**19.00** Чарапашкі-Ніндзя (16+).
**20.50** Чарапашкі-Ніндзя-2 (16 +).
**22.50** Жахі (12+).
**0.35** Мільянер паняволі (12+).
**2.10** Аднакласнікі (16+).
**3.50** Аднакласнікі-2 (16+).



## ТБ1000 Рускае кіно

**5.55** Марафон жаданняў (16+).
**7.30** Я худзею (16+).
**9.15, 1.50** Прыгажуня ва ўдары (12+).
**11.05** 30 спатканняў (16+).
**12.50** З 8 Сакавіка, мужчыны! (12+)
**14.40** Аднакласнікі.ru: націсkай удачу (12+).
**16.35** Нянькі (16+).
**18.15** На кручку! (16+)
**20.00** Спякота (16+).
**21.45** Гуляй, Вася! Спатканне на Балі (16+).
**23.40** Лета (18+).
**3.25** Канікулы строгага рэжыму (12+).

## National Geographic

**6.00, 5.35** Навуковыя глупствы (16+).
**6.30** Панарама 360 градусаў: разбурэнне аб'ектаў сусветнай спадчыны (16+).
**7.15, 8.10** Падарожжы з Гарданам Рамзі (16+).
**9.00, 9.50** Інстынкт выжывання (16+).
**10.45, 21.00, 23.35, 22.40, 3.30** Дзікі тунец: Поўнач супраць Поўдня (16+).
**11.40** Дзікі тунец (16+).
**12.25** Неверагодныя цуды тэхнікі (16+).
**13.20, 14.10, 17.40** Аўта-SOS (16+).
**15.00** Служба бяспекі аэрапорта (16+).
**15.55** Злавіць кантрабандыста (16+).
**16.45** Неверагодныя цуды тэхнікі (16+).
**18.30, 18.55** Фабрыка ежы (16+).
**19.20** Расследаванні авіякатастроф (16+).
**20.10** Аляска: новае пакаленне (16+).
**21.50** Нязведаныя воды з Джэрэмі Уэйдам (16+).
**22.40** У дзікай прыродзе з Беарам Грылсам (16+).
**1.10** Тайная гісторыя каралёў крушэнняў (16+).
**2.00, 2.45** Асушыць акіян (16+).
**4.15** Міжнародны аэрапорт Дубай (16+).
**5.00** Гульні розуму (16+).

## Discovery

**8.00, 7.35, 1.50, 2.15, 2.45, 3.40, 4.04** Як гэта ўладкавана? (12+)
**8.25, 16.40, 22.10** Махінатары (12+).
**9.20, 20.20** Багажныя войны (12+).
**10.15, 21.15** Як гэта зроблена? (12+)
**11.10, 19.25, 4.27** Хуткія і гучныя (12+).
**12.05, 13.00** Як уладкаваны Сусвет (12+).
**13.55, 14.50, 15.45** Паміж небам і зямлёй (16+).
**17.35** Круты цюнінг (12+).
**18.30** Іржавая імперыя (12+).
**23.05, 5.14** Эд Стафард: гульня на вылет (16+).
**0.00, 6.01** Голыя і напалоханыя (16+).
**0.55, 1.20, 6.48, 7.12** Дзіўны свет жывёл (12+).

*У праграме магчымы змяненні.*
*Перадрукоўка праграмы забаронена.*
*[СЦ] – фільм трансляюцца са скрытымі субцітрамі.*

## Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 18.15, 0.35** Зона Х (16+).
**9.10, 22.15 Серыял «След» (16+).**
**10.50, 1.10** «Скажынемаўчы».
**11.45, 12.10, 13.05, 18.30, 19.20 Драма «Мой мілы знайдзёныш» (16+).**
**14.00** «Здорава здаровым быць!» (6+)
**14.45, 15.25 Драма «Намалюй мне маму» (16+).**
**15.10, 18.00** Навіны рэгіёна.
**17.05** Беларускі час.
**21.00** Панарама.
**21.45** Адзін дзень (12+).
**0.20** Сфера інтарэсаў.
**0.55** Дзень спорту.

## Беларусь 2

**6.00** «Уключайся!» (12+)
**9.00, 18.00** Тэлебарометр.
**9.05 Серыял «Сляпая» (16+).**
**10.10, 0.10** «Экстрасэнсы-дэтэктывы» (16+).
**11.05, 22.20 Серыял «Такая работа» (16+).**
**12.45** «Сямейныя гісторыі» (16+).
**13.20 Серыял «Жаночы доктар-5» (16+).**
**14.15, 18.05** «Арол і рэшка. Цуды свету-3» (16+).
**15.10** Анімацыйны серыял «Казачныя гісторыі» (0+).
**15.55** Нічога сабе ньюз (12+).
**16.00** «ПІН_КОД» (12+).
**16.55** «Вежа» (12+).
**17.45** М/с «Кузуркі» (0+).
**19.00 «Клон». Серыял (16+).**
**20.00** Камень, нажніцы, папера (16+).
**20.35** Гандбол. Ліга чэмпіёнаў. «Кіль» (Германія) — «Мяшкоў-Брэст» (Беларусь).

## Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.35, 12.10** «Беларуская кухня».
**8.05, 12.00, 15.30, 20.30, 23.25** Навіны культуры.
**8.15, 15.40 «Сільва». Маст. фільм (12+).**
**10.40** «Я хачу гэта ўбачыць!» (6+)
**11.05** «Кадры жыцця».
**12.40 «Упершыню замужам». Маст. фільм (12+) [СЦ].**
**14.15** «Люблю і памятаю».
**14.55, 21.05** «Апошні дзень» (12+) [СЦ].
**18.05** «Дыскатэка СССР». Канцэрт.
**19.00 «Старшына». Маст. фільм (12+) [СЦ].**
**20.40** «Калыханка» (0+).
**21.40 «З любімымі не разлучайцеся». Маст. фільм (12+) [СЦ].**
**23.00** «Кафедра».

## Беларусь 5

**7.00** Тэніс. WTA.
**9.00** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. «Манчэстэр Сіці» (Англія) — «Спортынг» (Партугалія).
**10.55** Хакей для ўсіх.
**11.25** Хакей. Чэмпіянат Беларусі. ХК «Гомель» — «Нёман» (Гродна).
**13.20** Слэм-данк.
**13.50** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. «Рэал» (Іспанія) — ПСЖ (Францыя).
**15.45** Агнявы рубеж.
**16.20** Біятлон. Кубак свету. Мужчыны.
**17.50** Хакей. КХЛ. Усходняя канферэнцыя. «Салават Юлаеў» (Уфа) — «Сібір» (Новасібірск).
**19.20** Хакей. КХЛ. Усходняя канферэнцыя. СКА (Санкт-Пецярбург) — «Дынама-Мінск».
**22.50** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА.

## АНТ

**6.00, 7.15, 8.15** «Наша раніца».
**6.30, 7.00, 7.30, 8.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** [СЦ], **20.30, 1.45** Нашы навіны.
**7.10, 8.10** «Трывожная кнопка» (16+).
**9.10** «Аб'ектыўНа» (16+).
**10.10** «Жыць выдатна!» (16+)
**11.15** «Модны прыгавор» (6+).
**12.20** «Бесталковыя нататкі» (12+).
**13.15, 23.50 Серыял «Насуперак лёсу» (16+).**
**15.10** «Давай пажэнімся!» (16+)
**16.20** «Мужчынскае / Жаночае» (16+).
**17.20, 18.20** «Насамрэч» (16+).
**18.50** «Удача ў прыдачу!» (12+)
**18.55** «Няхай гавораць» (16+).
**20.00** Час.
**21.15** «Маркаў. Нічога асабістага» (16+).
**21.55 Серыял «Янычар» (16+).**

## СТБ

**6.00, 6.40, 7.45, 8.40** «Раніца СТБ».
**6.30** [СЦ], **7.30** [СЦ], **8.30** [СЦ], **10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны».
**9.00, 0.00** «Загадкі чалавецтва з Алегам Шышкіным» (16+).
**9.50** «Глядзець усім!» (16+)
**10.40** «Горка-2!» (16+).
**12.20, 20.50, 0.45** «Самыя шакавальныя гіпотэзы» (16+).
**13.45, 23.10** «Таямніцы Чапман» (16+).
**14.35, 21.35** «Неверагодна цікавыя гісторыі» (16+).
**15.25, 16.50 «Павук». Серыял (16+).**
**20.20, 23.05** «СТБ-спорт».
**20.25** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.35** «Міншчына».

## МІР

**5.00, 10.10 Серыял «Балабон» (16+).**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**13.15, 18.05** «Справы судовыя. Грошы вярніце!» (16+)
**14.10** «Справы судовыя. Бітва за будучыню» (16+).
**15.05** «Справы судовыя. Новыя гісторыі» (16+).
**16.15** «Справы судовыя. Бітва за будучыню» (16+).
**17.10** «Міравое пагадненне» (16+).
**19.25, 20.10** «Гульня ў кіно» (12+).
**20.55, 21.55** «Слабае звяно» (12+).
**22.55** «Назад у будучыню» (16+).
**23.50 Серыял «Свае» (16+).**
**1.20 Серыял «Чырвоная каралева» (16+).**

## РТР—Беларусь

**6.05** «Новая раніца».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Аб самым галоўным» (12+).
**12.35** «Кропкі над і» (16+).
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.30** «60 хвілін» (12+).
**17.30 Серыял «Зачэпка» (16+).**
**21.05 Серыял «Лізавета» (16+).**
**22.10, 23.40** «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым» (12+).

## НТБ—Беларусь

**6.05** «Астрапрагноз».
**6.10, 7.25, 8.20, 16.40, 19.50, 22.10, 23.40** Сёння. Галоўнае.
**6.15 Серыял «Масква. Тры вакзалы» (16+).**
**7.10** Сфера інтарэсаў.
**7.40** «Зламаць стэрэатыпы» (12+).
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**8.35, 22.15** «НЗ.by».
**8.55** Пракурорская праверка (16+).
**10.25 Баявік «Марскія д'яблы. Смерч» (16+).**
**13.25** Надзвычайнае здарэнне.
**13.50** «За гранню» (16+).
**14.50** «ДНК» (16+).
**16.45 Дэтэктыў «Пёс» (16+).**
**20.05, 22.35 Серыял «Першы аддзел» (16+).**
**23.55 Баявік «Драйв» (16+).**

## 8 канал

**7.00, 14.30, 18.10, 21.15, 1.10** «Надвор'е» + «Эрана».
**7.05, 14.35** Мультпарад (0+).
**7.30** «Прыколы 13-й школы» (6+).
**7.35 Серыял «Дзяцінства Шэлдана» (12+).**
**8.15, 11.00, 13.00 Серыял «Зыб» (16+).**
**9.45 Серыял «Новая Гвінея».**
**12.30** «Драйв выжывання» (16+).
**14.45 Прыгодніцкі фільм «Герцагіня і д'ябал» (12+).**
**16.30 Серыял «Сямейныя гісторыі» (16+).**
**18.15 Серыял «Наложніца» (16+).**
**20.00 Драма «Забор» (16+).**
**20.55** «Вечарніца» (0+).
**21.05** «Салам алейкум, Беларусь!»
**21.20 Трылер «Каралеўская гульня» (16+).**
**23.10 Камедыя «Аферыстка» (16+).**

## ВТБ

**6.05** «Лаві момант» (16+).
**7.00, 9.00** «Раніца з гумарам» (16+).
**11.00, 22.45** «КВЗ. Па-нашаму» (16+).
**12.00** «Гатуем як шэф» (16+).
**12.30** «Дурні і дарогі» (16+).
**13.30** Серыял «Апошні з Магікян» (16+).
**14.30, 18.30** Серыял «#СеняФедзя» (16+).
**16.00** «Міша псуе ўсё» (16+).
**17.00, 0.55** «Форт Баярд» (16+).
**20.00** «Рускія не смяюцца» (16+).
**21.00** Баявік «Перавозчык: спадчына» (16+).
**0.00** Серыял «Каманда Б» (16+).
**2.15** Серыял «Кадэцтва» (12+).
**3.50** «Адна за ўсіх» (16+).
**5.10** «6 кадраў» (16+).

## Культура

**6.30, 7.00, 7.30, 8.30, 10.00, 15.00, 19.30, 23.40** Навіны культуры.
**6.35** «Пешшу...»
**7.05** Легенды сусветнага кіно.
**7.35** «Чалавек — гэта выпадковасць? Што прымусіла мозг расці». Дак. фільм [СЦ].
**8.35** «Забытае рамяство». Серыял.
**8.50, 15.50** «Капітан Нэма». Маст. фільм.
**10.15** «Назіральнік».
**11.10, 0.00** ХХ стагоддзе.
**12.05, 22.15** «Бярозка». Серыял [СЦ].
**13.05** Колер часу.
**13.20** Дзень архіваў. «Архіў асаблівай важнасці». Дак. фільм.
**14.05** Лінія жыцця [СЦ].
**15.05** Навіны. Падрабязна. Тэатр.
**15.20** Пернікавы домік [СЦ].
**17.00** Раман у камені. «Самара. Дом Сандры». Дак. фільм.
**17.30, 1.50** Дзяніс Шапавалаў, Уладзімір Федасееў і Вялікі сімфанічны аркестр імя П. І. Чайкоўскага.
**18.30** «Першыя ў свеце». Серыял.
**18.45** «У пошуках Візантыі». Дак. фільм [СЦ].
**19.45** «Галоўная роля».
**20.05** Адкрытая кніга.
**20.30** «Добрай ночы, малыя!»
**20.45** Кіно пра кіно [СЦ].
**21.30** «Энігма. Лахаў Шані».
**23.10** «Адлюстраваны час». Серыял.
**0.55** «Эрнэст Бо. Імператар рускай парфумерыі». Дак. фільм [СЦ].

## Настальгія

**6.00** «Спяем, сябры!» (12+)
**7.00** Маст. фільм «Кахаць» (18+).
**8.10, 9.40, 11.00, 12.45, 14.20, 15.40, 17.00, 18.50, 20.35, 21.40, 23.00, 1.00, 2.40, 3.40, 5.00** Музычная настальгія.
**8.25, 5.25** «Блеф-клуб» (16+).
**9.00, 15.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час» (12+).
**10.00, 16.00, 22.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР».
**12.00** «Быў час» (16+).
**13.00** Маст. фільм «Матылькі» (18+).
**18.00** «Эліта Краіны Саветаў» (12+).
**19.15** Маст. фільм «Шалёная баба» (18+).
**23.45** «Мастак і паэт Міхаіл Гробман чытае свае вершы» (18+).
**0.00** «СевАлогія» (18+).
**1.30** Маст. фільм «Рабро Адама» (18+).

## EuroSport 1

**1.00, 14.05** Тэлечасопіс Discovery Golf (6+).
**1.30, 7.00, 15.30, 16.15** Веласпорт. «Парыж — Ніца» (16+).
**2.30, 8.00, 14.35, 18.00** Веласпорт. «Тырэна — Адрыятыка» (16+).
**3.30, 4.00, 9.00, 9.45** Горныя лыжы. КС. Мужчыны (16+).
**5.00, 19.15, 20.00** Снукер. Turkish Masters (6+).
**14.00** The Minute (16+).
**19.55** Навіны (16+).
**23.00** Тэлечасопіс «Пражэктар спорту» (16+).

## Кінакамедыя

**0.45** Бабро паржакалаваць (16+).
**3.20** Сябраваць па-руску! (18+)
**5.05** Лаві момант (16+).
**6.35** Кракадзіл Дандзі (12+).
**8.25** Дзядуля нялёгкіх паводзін (6+).



**10.10** Крымінальная фішка ад Генры (16+).
**12.10** Клік: з пультам па жыцці (12+).
**14.05** Дзядуля лёгкіх паводзін (18+).
**16.00** Дзе мая тачка, чувак? (12+)
**17.30** Копы ў глыбокім запасе (16+).
**19.30** На рыбалку! (12+)
**21.15** Аслеплены жаданнямі (16+).
**22.55** Чаго жадаюць жанчыны? (16+)



## ТБ3

**6.00** Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
**9.40** «Гадзіннік кахання» (16+).
**10.35** «Улегцы» (12+).
**11.05** «Вялікая маленькая хлусня». Серыял (16+).
**12.25, 18.10** «Знакі лёсу» (16+).
**13.00, 17.00** «Старац» (16+).
**14.05, 18.45, 3.10** «Сляпая» (16+).
**15.10, 19.55, 4.05** «Вараджбітка» (16+).
**16.20** «Цуд» (12+).
**21.05, 2.30** «Мошчы. Доказ цуду». Дак. фільм (16+).
**22.00** «Мая» (16+).
**23.05** «Дзённік экстрасэнса» (16+).
**0.05** «10 самых» (16+).
**0.35** «Слёзы сонца» (16+).
**4.30** «Суд ідзе». Серыял (16+).

## ТБ1000

**5.45, 6.25, 17.15, 18.05** Элементарна (16+).
**7.25** Жахі (12+).
**9.25** Чарапашкі-Ніндзя (16+).
**11.15** Чарапашкі-Ніндзя-2 (16 +).
**13.15** Мільянер паняволі (12+).
**15.05** Мексіканец (16+).
**19.00** Вяртанне супермена (12+).
**21.45** Хэнкок (16+).
**23.25** Пасля нашай эры (16+).
**1.05** Прынцэсы Манака (16+).
**2.45** Дзіяна: гісторыя кахання (12+).

## ТБ1000 Рускае кіно

**5.10** Любіць не любіць (16 +).
**6.30** Пра што маўчаць дзяўчаты (12+).
**8.00, 16.25** Спякота (16+).
**9.40** Той яшчэ..! (12+)
**11.10** Кур'ер з раю (12+).
**12.55** На кручку! (16+)
**14.30** Гуляй, Вася! Спатканне на Балі (16+).
**18.15** Ну, добры дзень, Аксана Сакалова! (16+)
**20.05** Бабуля лёгкіх паводзін (16+).
**21.40** Бабуля лёгкіх паводзін-2. Састарэлыя мсціўцы (16+).
**23.10** Прабабуля лёгкіх паводзін. Пачатак (16+).
**0.50** 3 пяці да сямі (18+).
**2.30** Сэрца і як ім карыстацца (16+).
**3.55** Жыццё наперадзе (16+).

## National Geographic

**6.00** Навуковыя глупствы (16+).
**6.35** Панарама 360 градусаў: разбурэнне аб'ектаў сусветнай спадчыны (16+).
**7.25, 8.15** Падарожжы з Горданам Рамзі (16+).
**9.05, 10.00** Інстынкт выжывання (16+).
**10.50, 12.35, 16.50, 23.40, 0.35** Дзікі тунец: Поўнач супраць Поўдня (16+).
**11.45** Дзікі тунец (16+).
**13.20, 14.10, 17.40** Аўта-SOS (16+).
**15.05, 21.50** Служба бяспекі аэрапорта (16+).
**15.55** Злавіць кантрабандыста (16+).
**18.30, 18.55** Фабрыка ежы (16+).
**19.15, 20.05, 21.00, 3.35** Расследаванні авіякатастроф (16+).
**22.45** У дзікай прыродзе з Беарам Грылсам (16+).
**1.15** Тайная гісторыя караблекрушэнняў (16+).
**2.00, 2.45** Асушыць акіян (16+).
**4.25** Міжнародны аэрапорт Дубай (16+).
**5.15** Гульні розуму (16+).

## Discovery

**8.00, 13.55, 14.20, 14.50, 15.15, 15.45, 16.10, 7.35** Як гэта ўладкавана? (12+)
**8.25, 16.40, 22.10** Махінатары (12+).
**9.20, 20.20, 20.45** Багажныя войны (12+).
**10.15, 21.15** Як гэта зроблена? (12+)
**11.10, 19.25, 4.27** Хуткія і гучныя (12+).
**12.05** Эд Стафард: гульня на вылет (16+).
**13.00** Голыя і напалоханыя (16+).
**17.35** Круты цюнінг (12+).
**18.30** Іржавая імперыя (12+).
**23.05, 0.00, 0.55, 5.14, 6.01, 6.48** Залатая ліхаманка (16+).
**1.50, 2.15, 3.10, 3.40, 4.04** Склады (12+).

*У праграме магчымы змяненні.*
*Перадрукоўка праграмы забаронена.*
*[СЦ] – фільм трансліюецца са скрытымі субцітрамі.*

# РАМОНТЫ ПАД'ЕЗДАЎ, ВІДЭАНАЗІРАННЕ, ДВАРЫ...

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 7–й стар.)*

Канешне, трэба ўкладваць свае сродкі. Як ідзе гэты працэс? — перапытвае суразмоўніца і тут жа адказвае: — Калі людзі хочуць, каб было прыгожа і камфортна, яны робяць гэта. Збіраюць сродкі і вядуць работы. Многія і раней аднаўлялі свае пад'езды, бо прывыклі лічыць, што самі здольны палепшыць сваё жыццё, а не чакаць, пакуль гэта зробіць нехта. А цяпер такая работа будзе весціся паўсюдна.

> Напрыклад, як вядуцца рамонты ў пад'ездах? Згодна з новым заканадаўствам, цяпер такія работы аплачваюць самі жыхары. Мая суразмоўніца расказала, што ў гэтым кірунку яны пайшлі па шляху кампрамісу.

Яшчэ адна даволі слушная пазіцыя — відэаназіранне. Устаноўка сістэмы таксама патрабуе згоды большай часткі жыхароў дома. І ахвотных няма. Напрыклад, у ЖЭСе № 11 кожны трэці дом мае такую сістэму. Як правіла, працуе дзве камеры — у пад'ездзе і на ўваходзе. Многія падключаюць паслугу прагляду анлайн. Менавіта відэакамера дазваляе выявіць правапарушэнні. «Гэта яшчэ і пытанні бяспекі», — растлумачыла Наталля. Здаецца, яна ў курсе ўсіх падзей сваёй тэрыторыі.

Напрыклад, днямі прыйшлося з міліцыяй разбірацца з расклейкай лістоў у пад'ездзе. Аказалася, што сюды пранік незнаёмец. Міліцыя займаецца яго пошукам. Таксама быў выпадак: згубіўся хлопчык. Бацькі звярнуліся ў міліцыю. Калі сталі праглядаць відэа, убачылі, што іх сямігадовы сын пайшоў у чужы пад'езд. Аказалася, што там жыў хлопчык, з якім ён гуляў у двары. Супрацоўнікі міліцыі абышлі ўсе кватэры і знайшлі яго праз некалькі гадзін. А бацькам патлумачылі, што на дзіця ў такіх выпадках нельга крычаць, а трэба спакойна з ім паразмаўляць. Пасля перажытага стрэсу бацькі прынялі рашэнне купіць сыну наручны гадзіннік з функцыяй вызначэння знаходжання.

Наталля прыгадала яшчэ адзін даволі паказальны выпадак. Уладальнік аўтамабіля ўбачыў, што у яго машыны, якая стаяла каля дома, пашкоджана лабавое шкло. Мужчына стаў з падазрэннем ставіцца да кожнага: а ці не ён гэта зрабіў? Але пры праглядзе запісу з відэакамеры было відаць, што моцны вецер падняў і кінуў на шкло нейкі прадмет. «Ніхто не вінаваты. А калі б не відэа, аўтаўладальнік думаў бы на сваіх ды суседзяў, гэта вылілася б у агрэсію. А тут проста форс-мажорныя абставіны», — паясніла Наталля.

Напрыканцы размовы зноў вяртаемся да прыемнага — узнагароды. Дарэчы, іх за час работы ў актывісткі было нямала. Некаторыя потым сталі падарункамі для іншых. Напрыклад, леташні электрачайнік члены камітэта вырашылі перадаць шматдзетнай сям'і, дзе растуць сямёра дзяцей. На грашовыя прэміі зладзілі салодкі стол для жанчын — ветэранаў працы. Гэтым разам падарункам стаў чайны сервіз. «Будзем гарбату з яго піць на 8 Сакавіка», — усміхаецца Наталля.

Цікаўлюся, ці не збіраецца іх камітэт прыняць удзел у конкурсе грамадзянскіх ініцыятыў, які цяпер шырока рэкламуецца ўладамі. «Магчыма, — коратка адказвае яна і дадае. — Было б добра з падтрымкай фонду заняцца добраўпарадкаваннем двароў, дзіцячых пляцовак, інклюзіўным асяроддзем». Відавочна, што задумак у Наталлі нямала. І энергіі таксама.

**Маргарыта УШКЕВІЧ,**
**фота аўтара.**



**Наталля САСІМ *(справа)* сярод пераможцаў абласнога конкурсу Асацыяцыі мясцовых Саветаў дэпутатаў.**

**Старшыня Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў Ігар ЖУК:**

— Стварэнне фонду грамадзянскіх ініцыятыў — ідэя нашай абласной асацыяцыі мясцовых Саветаў. Гэта ініцыятыва падтрымана і ўрадам, і Саветам Рэспублікі. Ёсць адпаведны ўказ Прэзідэнта аб стварэнні фонду грамадзянскіх ініцыятыў. Мы на ўзроўні вобласці правялі конкурс, выйгралі 14 праектаў. На іх рэалізацыю Банкам развіцця выдзелена 100 тысяч рублёў.

Сёлета пры падтрымцы аблвыканкама створаны свой аналагічны фонд у памеры 200 тысяч рублёў. Гэта таксама салідная сума для рэалізацыі праектаў, якія дазволяць у тым ліку добраўпарадкаваць нашы населеныя пункты, гарады, стварыць больш камфортныя ўмовы для жыцця. А тое, што зроблена сваімі рукамі, і цэніцца больш. Самі людзі будуць сачыць за парадкам на гэтай тэрыторыі.

РАЗГЛЕДЖАНА НА СЕСІІ

# МАТРЫЦА РУХУ

## У Гродзенскай вобласці дэпутаты вызначылі стартавыя пазіцыі для далейшага развіцця

**На сумесным пасяджэнні аблвыканкама дэпутаты заслухалі інфармацыю аб тым, як спрацаваў рэгіён летась, вызначылі задачы на сёлетні год. Было адзначана, што эканоміка Гродзенскай вобласці паказала ў 2021 годзе ўстойлівы рост. Унутраны рэгіянальны прадукт вырас больш чым на 5 %, на 16 % удалося павялічыць даходы кансалідаванага бюджэту рэгіёна. Гэта дазволіла выканаць не толькі ўсе сацыяльныя абавязацельствы, але і павялічыць фінансаванне інвестыцыйнай праграмы, у тым ліку аб'ектаў сацыяльнай сферы.**

### Захаваць дынаміку

Бюджэт, па словах старшыні аблвыканкама Уладзіміра Караніка, выкананы з прафіцытам. Даходы выраслі больш чым на 16 %, што дазволіла сфарміраваць даволі трывалую падушку бяспекі і пазбегнуць рызыкі і цяжкасці з фінансаваннем тых аб'ектаў, якія цяпер рэалізоўваюцца ў рэгіёне.

Што датычыцца драйвераў эканомікі, найбольшы рост паказала прамысловасць. А вось у сельскай гаспадарцы назіраецца невялікае зніжэнне аб'ёмаў вытворчасці. У прыватнасці, мінусуе раслінная галіна, дзе з-за кліматычных умоў адбыўся недабор зерня. Між тым паказчыкі ў сельскай гаспадарцы ўжо цяпер выходзяць на заўважную траекторыю росту, падкрэсліў кіраўнік рэгіёна.

— Каб захаваць станоўчую дынаміку на сёлетні 2022 год і забяспечыць далейшы рост эканомікі рэгіёна, важна разгледзець аб'ектыўныя і суб'ектыўныя праблемы раёнаў, — зазначыў Уладзімір Каранік. — Гэта дазволіць ажыццявіць запуск новага інвестыцыйнага цыкла для фінансавання сацыяльных інфраструктурных праектаў. Менавіта сацыяльным аб'ектам удзяляецца



асаблівая ўвага. У прыватнасці, павялічылася фінансаванне медыцынскіх устаноў.

Як вядома, толькі рост эканомікі можа генерыраваць існуючы рост даходаў насельніцтва. За мінулы год рост намінальнай заработнай платы склаў амаль 115 %, што, у сваю чаргу, дазволіла павялічыць бюджэт за кошт падаходнага падатку.

### Экспарт ставіць рэкорды

Значны прыбытак атрыманы ад экспартнай дзейнасці. Увогуле, гэты кірунак у рэгіёне назвалі «знешнегандлёвым цудам». Па словах **намесніка старшыні аблвыканкама Віталя НЯВЕРЫ**, экспартныя пастаўкі, нягледзячы на санкцыі і абмежаванні, ставяць рэкорды. Так, за мінулы год упершыню аб'ём знешняга гандлю пераваліў за 5 мільёнаў долараў ЗША. Аб'ём экспарту вырас у вобласці больш чым утрая. Упершыню за апошнія тры гады на станоўчую траекторыю выйшаў экспарт паслуг.

Дарэчы, на экспарт пачынае арыентавацца ў большай ступені і комплекс АПК. І хоць аграрны сезон летась быў не самы ўдалы за апошнія гады, менавіта канкурэнтная прадукцыя прадпрыемстваў аграпрамысловага комплексу дазволіла прынесці значны прыбытак сельскагаспадарчай галіне. Заданне па экспарце перавыканана на 25 %. У далейшым стаіць задача захаваць станоўчую дынаміку развіцця як жывёлагадоўлі, так і раслінаводства. Толькі такім чынам атрымаецца забяспечыць харчовую бяспеку краіны. У ходзе пасяджэння была звернута ўвага на выканаўчую дысцыпліну кадраў у сферы АПК. Адзначалася, што без гэтага нельга дасягнуць высокіх вынікаў.

### Увага — медыцыне

У ходзе пасяджэння быў дадзены аналіз сённяшняй эпідсітуцыі рэгіёна. Як зазначыў Уладзімір Каранік, трэці тыдзень назіраецца ўстойлівае зніжэнне па захваральнасці на вострыя рэспіраторныя інфекцыі як дарослых, так і дзяцей. Пік захваральнасці ў Гродзенскай вобласці пройдзены. Назіраецца значнае зніжэнне прыёмаў у паліклініках, якія падчас пад'ёму эпідсітуацыі працавалі і ў выхадныя дні.

Між тым па-ранейшаму вядзецца вакцынацыя насельніцтва, у тым ліку і падлеткаў. Можна казаць аб тым, што праслойка сярод дзяцей, якія маюць імунітэт супраць каранавіруса, ужо сфарміравана. Зараз медыцынская служба скіравана на тое, каб больш пільна назіраць за магчымымі познімі ўскладненнямі пасля перанесенай каранавіруснай інфекцыі. Гэтаму будзе аддавацца асаблівая ўвага падчас планавых медыцынскіх аглядаў і дыспансерызацыі. Разам з тым не губляе актуальнасці і вакцынацыя, якая дазволіць набыць так званы гібрыдны імунітэт.

Увогуле, медыцынскай галіне надавалася і будзе надавацца першаснае значэнне. Расходы на медыцыну склалі 711 мільёнаў рублёў. З іх 660 мільёнаў затрачана на першасныя патрэбы, у тым ліку аплату працы медыкам, лекавыя сродкі. Разам з тым, у рэгіёне ўдалося павялічыць экспарт медыцынскіх паслуг.

### Будуем дарогі разам

Не зніжае сваіх пазіцый і будаўнічая сфера. Летась удалося ўвесці ў строй 430 тысяч квадратных метраў жылля, што на 10 тысяч больш, чым запланавана. Не губляе актуальнасці развіццё мікрараёнаў індывідуальнай забудовы. І такі напрамак зараз даволі папулярны ў гродзенцаў, хоць і мае пэўныя праблемныя моманты. У прыватнасці, дарожнае пакрыццё. Каб пакласці верхні слой асфальту, неабходны праект з усімі атрыбутамі — тратуарамі, водаадвядзеннем, асвятленнем... А гэта вельмі затратны і доўгі працэс. Таму старшыня аблвыканкама Уладзімір Каранік выйшаў з прапановай накіраваць на гэтыя мэты сродкі фонду грамадзянскіх ініцыятыў і прыцягнуць да работы саміх жыхароў мікрараёна. Яны будуць фінансаваць толькі тую частку работ, якая датычыцца дарожнага пакрыцця. Напрыклад, змогуць падрыхтаваць дарогу пад асфальт. Такі пілотны праект можа стаць прыкладам для ўсёй краіны і дазволіць хутчэй вырашыць праблемы дарог у раёнах індывідуальнай забудовы, упэўнены кіраўнік рэгіёна.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

ТОЕ, ШТО ВАЖНА

# ПА ПАКУПКІ — З ДЭПУТАЦКІМ СПІСАМ

**У рэгіёнах Гомельшчыны дэпутаты працягваюць маніторынг цэн на харчовую групу тавараў і лекаў айчыннай вытворчасці. У Ельску такую ініцыятыву раённы Савет дэпутатаў ажыццяўляе пры падтрымцы прафсаюзаў, мясцовых Саветаў і члена Савета Рэспублікі. Галоўная мэта — прааналізаваць наяўнасць спажывецкіх тавараў і аптэчны асартымент, каб спрацаваць на прафілактыку ажыятажу і дэфіцыту сацыяльна значных прадукцыі.**




З гэтай нагоды старшыні раённага Савета дэпутатаў Аксана ЗАХАРЧАНКА і раённага аб'яднання прафсаюзаў Алена ЗАХАРАНКА сумесна з галоўным спецыялістам аддзела эканомікі райвыканкама Валянцінай КІТУН наведалі адну з самых папулярных крам сеткавага рытэйлера ў Ельску. Яны правялі маніторынг цэн на сацыяльна значныя тавары. У пераліку 89 акрэсленых пазіцый: пладова-агародніннная прадукцыя, хлеб, крупы, макаронныя вырабы, раслінны алей, кансервы агародніннныя і рыбныя, рыба, сухафрукты, цукар, соль, чай, сокі, нектары і іншае. Таксама ў пералік для маніторынгу ўвайшлі такія новыя пазіцыі як, кашы, сумесі і фруктовыя пюрэ для дзіцячага харчавання, падгузкі, мыла, туалетная папера і запалкі.

— Маніторынг цанавой сітуацыі на спажывецкім рынку праводзіцца ў сувязі з пастановай урада «Аб часовых мерах па стабілізацыі цэн на сацыяльна значныя тавары першай неабходнасці», — нагадвае кіраўнік дэпутацкага корпуса раёна Аксана Захарчанка. — Такія маніторынгі на тэрыторыі Ельску праводзяцца штомесяц у дзвюх самых папулярных крамах горада. Гэта дае магчымасць сачыць за змяненнямі ўзроўню цэн на сацыяльна значныя тавары для насельніцтва, аналізаваць пакупніцкую здольнасць нашых людзей, рэагаваць на сацыяльны запыт на тыя ці іншыя тавары

Падчас сумеснага маніторынгу гандлёвых аб'ектаў фіксуюцца мінімальныя цэны па ўказаных пазіцыях.

— Пасля даныя заносяцца ў спецыяльную праграму, дзе робім аналіз, а звесткі адсылаем ужо ў нашу вышэйшую арганізацыю, — адзначае суразмоўніца.

> Так, цэны фіксуюцца на пэўную дату, а затым параўноўваюцца з тымі, якія былі раней. Параўнальны аналіз цэн праводзіцца па кожнай пазіцыі групы тавараў. На асаблівым кантролі — выяўленне асобных або сістэмных праблемных сітуацый.

Дарэчы, падчас рэвізій крамных прылаўкаў, заўважаюць удзельнікі маніторынгу, фіксуюцца не толькі цэны на тавары, але і правяраецца наяўнасць сацыяльна значных пазіцый, ці ёсць ажыятаж і дэфіцыт на асобныя з іх, цікавяцца пакупніцкім попытам у прадаўцоў і меркаваннямі аб асартыменце крам пакупнікоў.

— Хлебабулачныя вырабы, малочная і мясная прадукцыя — тое, што традыцыйна самае папулярнае ў спажывецкай карзіне. Мы назіраем, што неабгрунтаванага рэзкага росту на гэтыя пазіцыі не адзначаецца, — падзялілася Аксана Захарчанка. — Вынікі маніторынгу паказалі, што прадукты першай неабходнасці з'яўляюцца даступнымі для ўсіх спажыўцоў раёна. Перавышэння ўстаноўленага ўзроўню цэн у крамах не зафіксавана. Варта адзначыць, што такі грамадскі кантроль за цэнамі прывучае і пастаўшчыкоў, і ўладальнікаў рэгуляваць цэнавую палітыку ў інтарэсах спажыўцоў.

Асобная ўвага аддаецца наяўнасці найбольш запатрабаваных лекаў у аптэках. У спісе адзначаных лекавых сродкаў — 50 пазіцый.

— Мы глядзім на тую лінейку медыцынскіх прэпаратаў, якая сёння найбольш запатрабаваная, — падкрэсліваюць удзельнікі маніторынгу. — Гэта ў першую чаргу супрацьвірусныя лекі, а таксама тыя, якія выкарыстоўваюцца для папярэджання захворванняў сэрца, звяртаем увагу на наяўнасць антысептыкаў і масак.

> Аналіз сітуацыі на рынку лекавых сродкаў у раёне паказвае, што ў цэлым сітуацыя з цэнамі на лекі з пераліку застаецца дастаткова стабільнай. Больш за тое, фіксуецца прымяненне гібкіх сістэм фарміравання цэн праз зніжкі для пакупнікоў.

Падчас апошняга такога маніторынгу ў аптэчнай сетцы райцэнтра была зафіксавана наяўнасць практычна ўсіх пазіцыі з пераліку лекаў, якія карыстаюцца павышаным попытам у насельніцтва. Адсутнасць якога-небудзь лекавага сродку не мела масавага характару.

Між тым, адзначае кіраўнік дэпутацкага корпуса раёна, у сельскіх населеных пунктах Ельскага раёна праводзіцца асобная пастаянная работа па аналізе пакупніцкай здольнасці людзей, даступнасці прадукцыі гандлёвых аб'ектаў, наяўнасці ў іх неабходнага асартыменту тавараў. Усё гэта ацэньваецца з пазіцыі забеспячэння дзяржаўных сацыяльных стандартаў па абслугоўванні насельніцтва. Аксана Захарчанка ўпэўненая, што выкананне сацыяльных стандартаў сёння застаецца адной з найважнейшых задач дзяржаўнай падтрымкі людзей на вёсцы.

— У цэлым у раёне ў вёсках працуе 59 гандлёвых аб'ектаў, — заўважыла кіраўнік дэпутацкага корпуса. — Не можа не радаваць, што апошнім часам у сельскай мясцовасці новыя пункты гандлю адкрываюць індывідуальныя прадпрымальнікі — жыхары нашага раёна. Канкурэнцыя за пакупніцкую стымулюе забяспечваць сельскіх спажыўцоў шырокім, якасным асартыментам тавараў, а таксама развіваць больш гібкую цэнавую палітыку.

Акрамя таго, не можа пакінуць па-за ўвагай дэпутат, новыя прыватныя пункты гандлю ўсё часцей адкрываюцца ў адрамантаваных аб'ектах нерухомасці, якія раней не выкарыстоўваліся. Для вёскі новыя крамы гарантуюць і дадатковыя рабочыя месцы для жыхароў, што таксама вельмі важна.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

ТЛУМАЧЫМ НЮАНСЫ

## Сумленныя адказы ў «Адкрытай студыі»

**У прамым эфіры праграмы «Адкрытая студыя» на Радыё «Гомель плюс» 103.7 FM член Савета Рэспублікі Аляксей НЯВЕРАЎ адказаў радыёслухачам на пытанні, якія датычыліся правядзення канстытуцыйнага рэферэндуму.**

— Хачу выказаць падзяку ўсім выбаршчыкам, якія ўзялі актыўны ўдзел у галасаванні, — падзякаваў старшыня Гомельскага абласнога аб'яднання прафсаюзаў, старшыня абласной камісіі па правядзенні рэферэндуму.

Ён адзначыў вельмі высокую яўку гамяльчан.

— Гэта гаворыць пра неабыякавасць да сваёй краіны і асабістай грамадзянскай пазіцыі. На выбарчых участках — гэта пазітыўны настрой сем'яў, дзяцей, людзей пажылога ўзросту, яркія творчыя культурныя праграмы, маштабны гандаль. Прыемна, што прапанаваныя змяненні і дапаўненні ў Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь грамадства падтрымала, — падкрэсліў сенатар падчас радыёэфіру.


Обществу с ограниченной ответственностью
«РОДАНАГРОСЛОНИМСКИЙ»
Слонимского района Гродненской области, работающему в направлении современного сельского хозяйства,

НА ПОСТОЯННУЮ РАБОТУ ТРЕБУЮТСЯ:

АГРОНОМ, ЗООТЕХНИК

**Требования:** высшее профильное образование, опыт работы в сельском хозяйстве, готовность и желание обучаться. Дисциплинированность, инициативность, исполнительность, умение работать с большим объемом информации, умение организовать и координировать работу, желание работать на результат, высокий уровень личной ответственности.

**Предлагаем:**

✔ Работу в современной компании с иностранным капиталом.
✔ Трудоустройство согласно ТК РБ.
✔ Достойную оплату труда: 2 000 – 4 000 руб. (уровень предлагаемой зарплаты: оклад + премиальные выплаты по результатам работы. Итоговая зарплата будет определена по результатам собеседования).
✔ Возможность обучения в лучших сельскохозяйственных организациях страны и за рубежом (ЕС).
✔ Возмещение расходов по найму жилого помещения.
✔ Система мотивации получения результатов труда.
✔ Корпоративная безлимитная мобильная связь.
✔ Социальный пакет согласно коллективному договору.

**Контакты:**

Резюме отправлять на e-mail: **mp@rodanagro.com**
Тел.: **+375 (33) 399-38-60**
**+375 (29) 318-22-65**
(отдел кадров)

УНП 592000776



Обществу с ограниченной ответственностью
«РОДАНАГРОСЛОНИМСКИЙ»
Слонимского района Гродненской области, работающему в направлении современного сельского хозяйства,

НА ПОСТОЯННУЮ РАБОТУ ТРЕБУЕТСЯ

ТРАКТОРИСТ-МАШИНИСТ СЕЛЬСКОХОЗЯЙСТВЕННОГО ПРОИЗВОДСТВА

**Требования:** опыт работы на энергонасыщенных тракторах, дисциплинированность, инициативность, исполнительность, ответственность, желание работать на результат, высокий уровень личной ответственности.

**Предлагаем:**

✔ Работу в современной компании с иностранным капиталом.
✔ Трудоустройство согласно ТК РБ.
✔ Достойную оплату труда: 2 000 – 4 000 руб. (уровень предлагаемой зарплаты: оклад + премиальные выплаты по результатам работы. Итоговая зарплата будет определена по результатам собеседования).
✔ Возможность обучения в лучших сельскохозяйственных организациях страны и за рубежом (ЕС).
✔ Возмещение расходов по найму жилого помещения.
✔ Система мотивации получения результатов труда.
✔ Корпоративная безлимитная мобильная связь.
✔ Социальный пакет согласно коллективному договору.

**Контакты:**

Резюме отправлять на e-mail: **wp@rodanagro.com**
Тел.: **+375 (29) 935-70-20**
**+375 (29) 318-22-65**
(отдел кадров)

УНП 592000776



МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

**РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.**
**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ АЛЯКСАНДР МІКАЛАЕВІЧ.**

**Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.**

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.
**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 311 17 35;
**e-mail:** info@zviazda.by
**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.**

**Тыраж 14.804.** **Нумар падпісаны ў 19.30 3 сакавіка 2022 года.**

# ЗЯЛЕНІВА З ПРЫСТАЎКАЙ «МІКРА»

## Ці варта ўключаць яго ў рацыён?

**Што такое мікразяленіва, пра якое пару гадоў таму звычайны спажывец і не чуў, а сёння дыетолагі і адэпты здаровага харчавання раяць дадаваць яго ў салаты і пасыпаць ім супы? Па сутнасці, гэта проста расада, якую вы вырасцілі і... з'елі. Ці тое сапраўды карысна? Давайце разбірацца.**

Цікавасць да прадуктаў харчавання, якія раней здаваліся нязвыклымі і незвычайнымі, зразумелая: у нашы дні з прычыны ковіду і пастаяннага стрэсу падтрыманне імунітэту важнае для ўсіх і кожнага. Дыетолагі сцвярджаюць, што ў мікразяленіве ў дзясяткі разоў больш ферментаў, чым у звыклым «дарослым» зяленіве і свежай гародніне. Знаходзячыся ў стадыі росту, мікразяленіва здольнае перадаць арганізму мноства карысных рэчываў. Напрыклад, бэта-карацін, які змяншчаецца ў мікразяленіве, абараняе скуру ад ультрафіялету і іншых шкодных уздзеянняў навакольнага асяроддзя. Маладыя парасткі ўтрымліваюць раслінны бялок, рэкордную колькасць вітамінаў (С, Е, К і групы В), шырокі спектр мінералаў (кальцый, калій, фосфар, жалеза, магній, ёд, сера), караціноіды (якія якраз і ўмацоўваюць імунітэт), фаліевую кіслату і эфірныя алеі. А таксама руцін, які прадухіляе ўтварэнне тромбаў, і антыаксідант хларафіл. Нутрыцыёлагі кажуць пра тое, што ўключэнне мікразяленіва ў рацыён на рэгулярнай аснове аздараўлівае страўнікава-кішачны тракт, нармалізуе абмен рэчываў і работу эндакрыннай сістэмы, запавольвае старэнне, падтрымлівае сэрца і сасуды, а таксама нервовую сістэму. Аргументы «за» такія: калі расліна актыўна расце, усе яе рэсурсы максімальна мабілізаваныя. Напрыклад, у парастках буракоў у дзясятак разоў большае ўтрыманне вітамінаў, чым у спелым бураку.

**У якасці мікразяленіва вырошчваюцца практычна любыя культуры — ад гарчыцы, зялёнай грэчкі, самай рознай капусты да кукурузы, розных відаў цыбулі, радыскі, дайкона, буракоў і нават сланечніку. А таксама збожжавыя культуры — праўда, пры непераноснасці глютэну мікразяленіва пшаніцы, жыта і ячменю ўжываць не варта.**

Словам, мікразяленіва — лагічнае развіццё ідэі дадавання ў рацыён прарошчанага насення, якая была папулярная ў прыхільнікаў здаровага харчавання апошнія 10 гадоў. Цуда-прадукты, зразумела, з'яўляліся і раней, і сучасны спажывец прывык да таго, што неўзабаве ажыятаж на той ці іншы прадукт харчавання спадае. Але пакуль што мікразяленіва навукоўцы называюць сапраўды вельмі карысным, спасылаючыся на праведзеныя даследаванні. Хоць тут ёсць і свае «падводныя камяні».

### КУПІЦЬ АБО ВЫРАСЦІЦЬ?

З пункту гледжання навукоўцаў-аграрыяў да паняцця «мікразяленіва» сёння адносяць сакавітае і далікатнае зяленіва агароднінных культур, перыяд вырошчвання якога — 10-14 дзён, вышыня раслін — 5-15 см (у хуткарослых гароху, сланечніку «рост» будзе вышэйшы, у капусных — ніжэйшы). У ежу мікразяленіва досыць шырока ўжываецца з 1980-х: у гэты час у Сан-Францыска шэфы-кухары элітных рэстаранаў пачалі выкарыстоўваць яго ў салатах. У 1990-х мікразяленіва стала гарнірам і інгрэдыентам страў у шэрагу больш бюджэтных рэстаранаў Заходняй Еўропы і ЗША. Тады варыянтаў было няшмат: на «мікрагрын» вырошчвалі ў асноўным руколу, базілік, каляндру. Сёння спектр значна шырэйшы. У якасці мікразяленіва вырошчваюцца практычна любыя культуры — ад гарчыцы, зялёнай грэчкі, самай рознай капусты да кукурузы, розных відаў цыбулі, радыскі, дайкона, буракоў і нават сланечніку. А таксама збожжавыя культуры — праўда, пры непераноснасці глютэну мікразяленіва пшаніцы, жыта і ячменю ўжываць не варта. Вырошчваюць таксама на «мікрагрын», напрыклад, настурцыю — мікразяленіва гэтай кветкі валодае ўласцівасцямі антыбіётыку, аказвае бактэрыцыднае і супрацьзапаленчае ўздзеянне і расшырае сасуды. А таксама амарант — у яго ружовыя лісточкі і яскравы арэхавы смак.

Папулярныя ў прамысловым вырошчванні віды мікразяленіва — гэта рукола (пікантны прысмак робіць яе выдатным гарнірам да мяса і рыбы), сельдэрэй (яго мікразяленіва — проста скарбніца кальцыю і калію), ліставая салата (смак далікатнейшы, чым у вялікага лісця), буракі (і ўпрыгажэнне стала, і ўмацаванне імунітэту), гарох (есці яго рэкамендуецца з лісцікамі і вусікамі, у салатах і ў якасці «пасыпкі» для агароднінных супоў).

Дзе ж узяць мікразяленіва? Можна купіць, можна вырасціць самастойна. Спачатку — ідзём у краму.

Прадаецца «мікрагрын» у аддзелах гародніны-садавіны — там, дзе прадстаўлены зялёныя салаты. Знайсці яго сёння ў буйных і не вельмі гіпермаркетах нескладана. Вытворчасць фермерская, айчынная. У асартыменце — рукола, гарох, капуста, буракі, радыска некалькіх відаў, мікс з базілікам і г. д. Зяленіва прапануецца пакупнікам як у зрэзаным выглядзе, пераважна ў экалагічнай папяровай упакоўцы, так і з каранямі, у пластыкавым латочку. Кошт — у сярэднім 5—5,30 рубля за 50 г і 3,30 за 30 г, каля 2,50 за 20-25 г. Мікс абыдзецца прыкладна ў 6 рублёў за 100 г. Калі пералічыць на цану за кілаграм, сумы атрымліваюцца сапраўды вялікія. Нельга сказаць, што прадукт папулярны: разглядаюць яго часта, а вось кладуць у кошык — рэдка. Цікавасць да прадукцыі праяўляе ў асноўным малады пакупнік, і ў большасці — жаночага полу.

— Дорага, вядома, у пераліку на кілаграм атрымліваецца. Але ж ніхто не купляе гэты прадукт кілаграмамі. Я бяру мікразяленіва часам, каб зрабіць разнастайным меню сям'і, — дзеліцца адна з пакупніц. — Дзеці добра ядуць салату з гэтымі маленькімі парасткамі.

— А я вырошчваю мікразяленіва дома, на падаконніку. Вы самі паглядзіце — тры галінкі за 3 рублі! І гэта разам з кубачкам — фактычна самога зяленіва тут грамаў 10-15, а не на 30, як паказана на ўпакоўцы. Танней вырошчваць мікразяленіва на падаконніку. Выдаткаў амаль ніякіх: пакецік насення — рубель-два, — уступае ў размову жанчына сярэдніх гадоў.

— Спачатку спрабавала вырошчваць такое зяленіва са звычайнага насення, — дзеліцца яна. — Потым купіла спецыяльнае, для мікразяленіва. І вельмі задаволеная. Усходжасць — сто працэнтаў. Ужо апрабавала ўсё, што ёсць у «Садовым свеце» з насення мікразяленіва. І вітаміны, і аздоба страў!

### ЯКОЕ СЕМЯ, ТАКОЕ І ПЛЕМЯ

Вырасціць мікразяленіва ў хатніх умовах можна двума спосабамі. Набыць у інтэрнэт-краме спецыяльны набор: латкі, субстрат для вырошчвання і некалькі відаў насення. Варыянтаў такіх набораў досыць шмат. Ці проста купіць насенне і высеяць яго самастойна. І тут таксама два варыянты: купіць менавіта насенне мікразяленіва або самае звычайнае насенне сельскагаспадарчых культур. Калі абраны апошні варыянт, важна ведаць, што на мікразяленіва вырошчваюцца амаль усе бабовыя, збожжавыя і агароднінныя культуры. Але ёсць выключэнні. І ў першую чаргу гэта паслёнавыя. Зразумела, бульбу наўрад ці хтосьці вырашыць вырошчваць, каб выкарыстоўваць у ежу яе лісце. Але і памідоры, і перац, і баклажаны ў якасці мікразяленіва неядомыя. Справа ў тым, што парасткі паслёнавых багатыя на саланін, ядавіты для чалавека (прыводзіць да нястраўнасці). Фасоля ў якасці мікразяленіва таксама ядавітая. Гарбузовыя культуры не падыходзяць для такой тэхналогіі вырошчвання з іншай прычыны — парасткі маюць выразны горкі смак. У астатнім кіруемся розумам і памятаем, што маладыя парасткі нагадваюць спелы плод ці лісце (у зялёных культур), толькі смак іх больш далікатны, «малочны». Такім чынам, смак мікразяленіва кінзы або гарчыцы будзе рэзкаваты, а самыя далікатныя варыянты — кукуруза, ліставая салата, сланечнік і гарох.

— Гэтая адмысловая тэхналогія вырошчвання гародніны была распрацавана яшчэ ў 1970-х, калі навукоўцы разважалі над тым, як забяспечыць людзей вітамінамі ў космасе, — распавядае **дырэктар РУП «Інстытут агародніцтва» Андрэй ЧАЙКОЎСКІ**. — Паступова тэхналогія знайшла прымяненне ў гарадскім асяроддзі: калі больш за 70 % насельніцтва пражывае ў гарадах, а вытворчасць гародніны знаходзіцца ў сельскай мясцовасці, вырошчванне мікразяленіва становіцца мэтазгодным. Іншая справа, што гэта хутчэй смакавая і вітамінная дабаўка. Відавочна, што наесціся мікразяленівам немагчыма. На сённяшні дзень мікразяленіва належыць да прадукцыі прэміум-класа — для людзей, гатовых укладваць грошы ў здаровае харчаванне, а таксама для тых, каму неабходная лячэбная дыета.

Як бяспечна вырасціць «мікрагрын» у сябе на падаконніку? Ці абавязкова набываць для гэтага спецыяльнае насенне? Аказваецца, лепш не скупіцца.

— Можна вырошчваць мікразяленіва і са звычайнага насення, — тлумачыць навуковец. — Але ў сусветнай практыцы селекцыянеры выводзяць для вытворчасці мікразяленіва спецыяльныя, асаблівыя сарты. Яны валодаюць лепшымі смакавымі якасцямі і біяхімічнымі ўласцівасцямі.

**Мікразяленіва — лагічнае развіццё ідэі дадавання ў рацыён прарошчанага насення, якая была папулярная ў прыхільнікаў здаровага харчавання апошнія 10 гадоў.**

